

ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ НЕПАЎНАЛЕТНІХ 4

ЗВЫЧКІ, ШТО ЗНІШЧАЮЦЬ ІМУНІТЭТ 7




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЛІСТАПАДА 2020 г. СЕРАДА № 230 (29344)


## ЛІЧБА ДНЯ

**943 981 расліну,**

*у тым ліку 538 642 дрэвы і 405 339 кустоў, высадзілі з пачатку года ў населеных пунктах краіны, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Толькі ўвосень прыродаахоўныя ведамствы пры падтрымцы арганізацый, прадпрыемстваў і грамадскасці пасадзілі ў населеных пунктах, на сельскагаспадарчых аб'ектах і ўздоўж аўтамабільных дарог 541 135 раслін па ўсёй краіне, з іх 217 083 дрэвы і 270 049 кустоў.*



# Уладар жалеза і агню



Дваццацігадовы жыхар вёскі Дукора Пухавіцкага раёна Аляксандр ЛЯВІЦКІ знайшоў сваё прызванне ў кавальскай справе і тры гады запар працуе ў вядомым музейным комплексе «Дудуткі» — куе адмысловыя сувеніры з жалеза, дае зацікаўленым майстар-класы. А іх, цікаўных, заўсёды нямала. Аляксандр кажа, што яго захапленне перадалося ад роднага дзеда, які таксама быў кавалём-саматужнікам.

— У дзядулі была свая кузня, і я з шасці гадоў прыходзіў, назіраў, як ён запальваў горан, награваў метал да чырвані, лёгка арудаваў малаткамі... Усё гэта мне так падабалася! Як падрос, дапамагаў яму, таму мае першыя ўрокі, бясспрэчна, ад дзеда Уладзіміра, — кажа Аляксандр.

Гэты сюжэт каля распаленага горна, калі я быў апошні раз у Дудутках, прывабіў сваёй душэўнасцю, цяплом і нават настальгіяй па нечым страчаным, родным. Разам з Аляксандрам Лявіцкім на фота — Данііл ФІЛІМОНАЎ — сын аднаго з супрацоўнікаў музея, які з цікавасцю назіраў за вогненным дзействам старажытнага рамяства.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **У Беларусі на вахтавы рэжым работы перайшло больш за 70 % стацыянарных устаноў сацабслугоўвання.**
- Сярэдні заробак у Беларусі ў кастрычніку склаў Br1285.
- **У Ляхавіцкім раёне адкрылі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў.**
- Беларуская чыгунка адправіць першы навагодні экспрэс у маёнтак Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы 24 снежня.
- **Колькасць кіберзлачынстваў у Гомельскай вобласці сёлета вырасла амаль у два разы.**
- Нацыянальная бібліятэка Беларусі запрашае на выстаўку малюнкаў Уладзіміра Караткевіча.




# Гараж. Некамедыя

### Чым небяспечныя ўзгаранні ў гаражных каапературывах?

**З пачатку года ў Мінску ратавальнікі выязджалі тушыць пажары ў гаражах восем разоў. Прычым па месяцах года гэтыя выпадкі размеркаваліся нераўнамерна: па два ў лютым і ў сакавіку, па адным разе — у красавіку і маі. Амаль паўгода тут панавала зацішша, і вось за першыя тры дні лістапада — два ўзгаранні.**

Чым жа небяспечныя такія пажары і чаму і як яны адбываюцца? Пра гэта спыталіся ў **афіцыйнага прадстаўніка Мінскага гарадскога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Вольгі МЕЛЬЧАНКІ.**

— Сярод сталічных раёнаў у сумных лідарах Фрунзенскі... А асноўная прычына, па якой адбываюцца такія здарэнні, — гэта парушэнне правіл выкарыстання электрычных сетак і абсталявання. Уладальнікі гаражоў выкарыстоўваюць падаўжальнікі, нярэдка перагружаюць сеткі, ды і само абсталяванне нярэдка знаходзіцца ў няспраўным стане. Радзей здараюцца пажары з прычыны неасцярожнага абыходжання з адкрытым агнём. Скажам, вырашыў пакурыць гаспадар гаража і выпадкова выпусціў недакурак. А той пачаў тлець.

У сховішчах для аўтамабіляў існуе даволі высокая пажарная нагрузка. Не сакрэт, што іх выкарыстоўваюць для захоўвання не толькі аўтамабіля, але і малапатрэбных рэчаў з дому. Да таго ж у гаражных масівах сценкі, як правіла, тонкія. А гэта значыць, што калі загарыцца адно памяшканне, то агонь можа вельмі лёгка перакінуцца на суседнія.

СТАР. 4

Размова па сутнасці

# ЁН БЫЎ ПРАРОК, ЁН БЫЎ РАМАНТЫК

### У чым прыцягальнасць асобы Уладзіміра Караткевіча

***Быў. Ёсць. Буду.***
***Таму, што заўжды, як праклятЫ,***
***Жыву бяздоннай трывогай,***
***Таму, што сэрца маё распята***
***За ўсе мільярды двухногіх.***



Фота Сяргея ПАНІЗНІКА.

**Уладзіміру Караткевічу, які напісаў гэтыя прарочыя радкі, у гэтыя дні споўнілася б 90 гадоў. Ён мог бы яшчэ жыць... Так, марна гараваць ды гадаць — колькі б яшчэ паспеў стварыць... Але асэнсоўваць тое, што ён нам пакінуў, значнасць яго асобы для Беларусі мы не перастанем ніколі. І сёння, у такі трывожны, складаны час, вялікі беларус Уладзімір Караткевіч — той, хто можа аб'яднаць, натхніць, даць надзею, падказаць шлях... У звяздоўскай дыскусіі пра яго, з-за «кавіднай» рэальнасці — завочнай, але ўсё ж дастаткова бурлівай, узялі ўдзел слынныя навукоўцы і пісьменнікі. І тыя, хто асабіста ведаў класіка, і тыя, хто не быў яго сябрам, але займаецца вывучэннем і папулярызацыяй яго творчасці.**

СТАР. 8–9

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Толькі наш народ мае права вырашаць»

**Прымаючы ўчора ад паслоў шасці краін і Мальтыйскага ордэна даверчыя лісты, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зрабіў заяву пра тое, хто і як можа змяніць яго на пасадзе кіраўніка дзяржавы.**

«Бягучы момант можна ацэньваць па-рознаму, але для нас відавочна адно — ***беларусы, як заўсёды было ў мінулым, даказалі сваю здольнасць адстаяць суверэнітэт краіны, традыцыйныя каштоўнасці і тэрытарыяльную цэласнасць, — сказаў на цырымоніі Прэзідэнт. — Неаднаразова заяўляў і яшчэ раз паўтару, што толькі наш народ мае права вырашаць, як будзе развівацца ў будучым беларуская дзяржава».***

## «Не варта ісці шляхам санкцый»

Карыстаючыся выпадкам, Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанне, якое апошнім часам, па яго словах, вельмі хвалюе заходнія дзяржавы.

«Вельмі перажываюць і будуюць розныя схемы ўздзеяння на беларускую ўладу і Прэзідэнта з мэтай звяржэння існуючага ладу, — сказаў ён. — Дайшлі да таго, што гатовыя падключыць да гэтага працэсу Расію, але не ведаюць, як. Раблю гэтую заяву на падставе жалезных, як кажуць у Кітаі, фактаў. Дык вось, у сувязі з гэтым хачу сказаць, што Прэзідэнта Беларусі можна адхіліць ад улады. Гэта рэальна. Падказваю шлях (ён адзін, іншых няма): толькі беларускі народ гэта зможа зрабіць. На падставе тых законаў, якія сёння існуюць, і беларускай Канстытуцыі».

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што прысутныя паслы Бангладэш, Ізраіля, Камбоджы, Кітая, Мальтыйскага ордэна, Намібіі і Пакістана не маюць адносін да такой пастаноўкі пытання, цырымонія ўручэння імі даверчых лістоў — толькі зручны момант, якім ён вырашыў скарыстацца, каб гэта сказаць.

«Зараз па ўсёй краіне ідзе дыялог пра будучае Беларусі і шляхі яе развіцця. У шырокую дыскусію ўцягнутыя шараговыя грамадзяне, працоўныя калектывы, эксперты, парламентарыі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і дзяржаўных структур, — працягнуў беларускі лідар. — Нам важна, каб было пачутае меркаванне кожнага. Усе канструктыўныя прапановы будуць уключаныя ў парадак дня Усебеларускага народнага сходу».

Беларусь вельмі зацікаўленая ў неканфліктным і эфектыўным супрацоўніцтве з іншымі дзяржавамі, у тым ліку з заходнімі, якія «так шукаюць шляхі змянення беларускага грамадства і нашай дзяржавы», падкрэсліў Лукашэнка.

***«Пры гэтым мы безумоўна выключаем любы палітычны і эканамічны ціск. У дыялогу з партнёрамі Беларусь прытрымліваецца прынцыпаў адкрытасці, прыстойнасці і раўнапраўя, любы ціск на нас, а тым больш увядзенне якіх-небудзь санкцый — я шчыра і адкрыта заяўляю: будуць аналагічныя адказы, і яны будуць больш балючыя для еўрапейскай супольнасці перш за ўсё,*** — акцэнтаваў Прэзідэнт. — Таму нам не варта ісці гэтым шляхам».

На фоне барацьбы з пандэміяй усё больш жорсткая канкурэнцыя ахоплівае глабальную эканоміку, адзначыў беларускі лідар. Сітуацыя ў свеце імкліва змяняецца, і яе складана прагназаваць. Нікуды не падзеліся старыя канфлікты. У такіх няпростых умовах дзяржавы імкнуцца выпрацаваць стратэгію эфектыўнага супрацьдзеяння выклікам і пагрозам.

«Як паказвае практыка, значна больш прадуктыўна гэта рабіць разам, — дадаў ён. — А не так, як гэта робяць, зноў на злосць, заходнія дзяржавы. Нядаўна, пасля дэкларацыі пра тое, што яны выдаюць Беларусі ажно 24 мільёны еўра ў гэтых складаных умовах, заявілі, што грошы пойдуць не на барацьбу з пандэміяй, а на развіццё грамадзянскай супольнасці. Чытай — падтрымку тых пратэсных акцый, якія адбываюцца ў Беларусі. І падтрымку так званай апазіцыі».

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што гэтыя грошы не даходзяць у Беларусь, іх паглынаюць «рознага роду каардынацыйныя саветы, якія створаныя за межамі нашай краіны ў якасці альтэрнатывы цяперашняму кіраўніцтву Беларусі, і тыя беглыя, якія сёння акапаліся ў Польшчы і краінах Балтыі, у прыватнасці, у Літве».

## «Надзейны партнёр для кожнай краіны»

«Беларусь сваімі ініцыятывамі на міжнароднай арэне даказала здольнасць уносіць канструктыўны ўклад у рашэнне розных праблем, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы з'яўляемся надзейным партнёрам для кожнай з краін, якую вы прадстаўляеце. Нам ёсць, што прапанаваць вам для супрацоўніцтва».

Традыцыйна Аляксандр Лукашэнка абазначыў сваё бачанне ўзаемадзеяння з кожнай з дзяржаў, даверчыя лісты якіх яму былі ўручаныя.

Характар адносін з КНР ён назваў даверчым усебаковым стратэгічным партнёрствам і ўзаемавыгадным супрацоўніцтвам.

«Беларусь актыўна ўдзельнічае ў кітайскай ініцыятыве «Пояс і шлях». Сёння гэта праект, які рэальна працуе і дае канкрэтную аддачу, мы ўсяк садзейнічаем яго спалучэнню з інтэграцыйнымі працэсамі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, наколькі магчыма», — дадаў Прэзідэнт.

Адзін з відавочных прыкладаў двухбаковага супрацоўніцтва — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», дзе ўжо працуе 67 замежных высокатэхналагічных кампаній. Асабліва Аляксандр Лукашэнка адзначыў распачатае на сродкі КНР будаўніцтва Нацыянальнага футбольнага стадыёна і басейна міжнароднага класа.

«Захоўваюцца добрыя тэмпы росту беларускага экспарту ў Кітай, — дадаў ён. — Па нашых ацэнках, у 2020 годзе аб'ём паставак сельгаспрадукцыі ў КНР упершыню дасягне 200 мільёнаў долараў. І я ўпэўнены, што гэта толькі пачатак».

Беларусь і **Ізраіль** звязвае шматвяковае сяброўства і агульная трагедыя Другой сусветнай вайны.

«Нашы дзяржавы паслядоўна адстойваюць абсалютную недапушчальнасць перагляду вынікаў гэтай вайны і гераізацыю нацызму. Дарэчы, у найбліжэйшы час наш парламент разгледзіць законапраект пра недапушчальнасць гераізацыі нацызму ў Беларусі, — паведаміў Прэзідэнт. — Гераізацыяй так званай сёння грашаць вельмі многія краіны, асабліва размешчаныя побач з намі. А дарэмна. Упэўнены, што ніякія заслугі перад Айчынай не могуць апраўдаць злачынства супраць чалавецтва!»

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў **Мальтыйскаму ордэну** за гуманітарную дапамогу, пастаўкі медыцынскага абсталявання, павышэнне кваліфікацыі беларускіх урачоў. Ордэн актыўна ўзаемадзейнічае з Беларуссю ў рамках міжнародных намаганняў па барацьбе з гандлем людзьмі.

«Асаблівае значэнне мы надаём супрацоўніцтву з **Пакістанам,** — спыніўся Прэзідэнт. — Сёння нам неабходна належным чынам выкарыстоўваць напрацоўкі, якія маюцца, і аддаць асаблівую ўвагу прамысловасці, сельскай гаспадарцы, адукацыі, фармацэўтыцы, ахове здароўя. Галоўнае — не спыняцца. Трэба ісці наперад, нягледзячы на розныя катаклізмы тут і там. Таму мы чакаем з нецярпеннем прэм'ер-міністра Пакістана Імрана Хана з афіцыйным візітам. Пра гэта мы з ім дамаўляліся зусім нядаўна».

**Бангладэш** для нас — важны і перспектыўны партнёр, абазначыў беларускі лідар.

Гатовы мы і да рэалізацыі канкрэтных праектаў з **Каралеўствам Камбоджа.** «Мы гатовы ствараць у вас патрэбныя вам прадпрыемствы і рыхтаваць для іх рабочыя кадры», — звярнуўся да пасла гэтай краіны Прэзідэнт.

Фарміраванне адносін з **Намібіяй** пакуль знаходзіцца ў самым пачатку, дадаў ён і запэўніў, што тут варта арыентавацца на дасягненне практычнага выніку і доўгатэрміновую перспектыву.

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею на тое, што новыя паслы будуць непрадузята і аб'ектыўна даносіць інфармацыю пра нашу краіну да свайго кіраўніцтва, а іх вопыт і прафесіяналізм стануць асновай канструктыўнага ўзаемадзеяння, практычныя вынікі якога не прымусяць сябе чакаць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «Гэты банк будзе працаваць на развіццё эканомікі»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў аднаўленне работы Белгазпрамбанка.**

У чэрвені ў ААТ «Белгазпрамбанк» з мэтай абароны інтарэсаў укладчыкаў і крэдытораў, недапушчэння пагаршэння яго фінансавага стану была ўведзеная часовая адміністрацыя, якую ўзначаліла Надзея Ермакова. Учора Аляксандр Лукашэнка падзякаваў ёй за тое, што ўдалося стабілізаваць сітуацыю ў гэтай фінансавай арганізацыі.

«Банк мы ні ў якім выпадку не будзем ліквідаваць, знішчаць, неяк пагаршаць яго работу, наадварот, мы зробім усё, каб ён функцыянаваў і прыносіў карысць нашай дзяржаве», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён прызнаўся, што быў прыемна здзіўлены, калі даведаўся, што банк за апошнія месяцы атрымаў звышпланавы прыбытак.

«Гэта добры сігнал. Хоць пытанні (аб'ёму. — **«Зв.»**) бізнесу яшчэ востра стаяць, — дадаў ён. — Бізнес пакуль не адноўлены, і гэта не звязана з той палітыкай, якую мы праводзім тут, унутры. Гэта, хутчэй за ўсё, звязана з той палітыкай, якая вядзецца партнёрамі банка. Але я думаю, гэта таксама будзе аднаўлена».

У сярэдзіне снежня заканчваецца тэрмін паўнамоцтваў часовай адміністрацыі Белгазпрамбанка, у сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка пажадаў абмеркаваць з Надзеяй Ермаковай яе бачанне новага кіраўніцтва і меры, якія фінансавая арганізацыя можа аказаць па падтрымцы беларускай эканомікі.

«Паколькі дзяржава робіць вельмі сур'ёзную стаўку на гэты банк. З прэзідэнтам Пуціным мы абмяркоўвалі гэту тэму, — паведаміў Аляксандр Лукашэнка. — Ён даслоўна мне заявіў пра тое, што банк павінен працаваць, навошта яго знішчаць, тым больш што гаспадары гэтага банка вельмі багатыя людзі. Маецца на ўвазе «Газпрам» і іншыя акцыянеры».

Камітэт дзяржаўнага кантролю завяршыў праверку фінансавай арганізацыі і праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, часовую адміністрацыю і акцыянераў банка пра яе вынікі.

«Гэты банк, я ўпэўнены, будзе працаваць на развіццё эканомікі, тым больш, як вы інфармавалі, што асобныя прадпрыемствы ўжо ад вас атрымалі добрыя крэдыты, і «дрэнныя» крэдыты ў вас знізіліся за гэты час», — рэзюмаваў беларускі лідар.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Спорт заўсёды быў і застаецца па-за палітыкай

## Беларускія атлеты звярнуліся да грамадскасці

**У штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі адбылося падпісанне звароту вядомых беларускіх атлетаў, чэмпіёнаў Алімпійскіх гульняў да грамадскасці і міжнароднай супольнасці. У цырымоніі прынялі ўдзел алімпійскія чэмпіёны Аляксандр Масяйкоў (Барселона, 1992 год), Яніна Правалінская-Карольчык (Сідней, 2000 год), Аляксей Абалмасаў (Пекін, 2008 год), Кацярына Карстэн (Атланта, 1996 год і Сідней, 2000 год), Сяргей Булыгін (Сараева, 1984 год).**

У звароце беларускія спартсмены заклікаюць айчынную і міжнародную грамадскасць пачуць іх і ўспомніць, што спорт заўсёды быў і застаецца па-за палітыкай. «Наш абавязак — не выступаць з палітычнымі заклікамі, а перамагаць на спартыўных арэнах, радуючы сваімі дасягненнямі нашых заўзятараў! На працягу доўгіх гадоў суверэннай гісторыі нашай краіны мы абаранялі сімвалы і колеры беларускага сцяга. Мы не хочам мяняць дзяржаўную сімволіку, пазбаўляцца гонару выступаць пад сцягам роднай краіны і не мець магчымасці падымацца на п'едэстал пад гукі беларускага гімна! Нам ёсць чым ганарыцца! Без перабольшання Беларусь жыве спортам. Наша краіна мае багатую гісторыю ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях: чэмпіёнамі і прызёрамі галоўных стартаў чатырохгоддзя ў розныя гады сталі больш за 190 спартсменаў, а нашы паралімпійцы заваявалі звыш 100 узнагарод. Акрамя спорту вышэйшых дасягненняў, падтрымліваецца і развіваецца масавы і дзіцяча-юнацкі спорт. Больш за два мільёны беларусаў займаюцца фізічнай культурай і спортам. Для іх функцыянуе больш за 23 тысячы спартыўных аб'ектаў, якія становяцца пляцоўкамі буйных нацыянальных і міжнародных спаборніцтваў», — гаворыцца ў звароце.

Аўтары звароту адзначаюць, што ўсё гэта не было б магчыма без каласальнай падтрымкі з боку беларускай дзяржавы, дзейнасці НАК Беларусі і нацыянальных федэрацый. «Каб захаваць усё гэта, сёння мы вымушаны гучна заявіць пра сябе з надзеяй быць пачутымі, заклікаем пакласці канец замахам на беларускі спорт звонку. Адкрытыя звароты ўдзельнікаў некаторых незаконных, псеўдаспартыўных структур, якія знаходзяцца за мяжой, на палітычныя тэмы носяць дэструктыўны характар і зневажаюць спартыўны і алімпійскі рух. Падобныя малалікія групы асоб не маюць права прадстаўляць інтарэсы, выказваць меркаванні і выступаць ад імя ўсіх беларускіх спартсменаў як на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і за яе межамі. Мы лічым недапушчальным наўмыснае распальванне варожасці і канфліктаў рознымі маніпуляцыйнымі спосабамі падачы інфармацыі і скажэннем фактаў, якія актыўна эксплуатуюцца падобнымі структурамі і накіраваныя на раскол спартыўнай супольнасці Беларусі, дзяленне спартсменаў на «сваіх» і «чужых». Мы лічым непрымальнымі і патрабуем спыніць настойлівыя заклікі да публічнага выказвання палітычных поглядаў, а таксама ўльтыматыўныя прапановы далучыцца да пэўнага палітычнага меркавання», — падкрэсліваецца ў звароце вядомых беларускіх атлетаў.

Яны асуджаюць спробы аказваць ціск на спартсменаў, іх сем'і, дзяцей у выглядзе адкрытых абраз і пагроз, у прыватнасці, у інтэрнэт-прасторы і сродках масавай інфармацыі, у выпадку адмовы спартсменаў выказваць меркаванне, якое ім навязваецца, або нежадання выказваць сваю палітычную пазіцыю. «Мы хочам жыць у міры і згодзе. Мы не хочам разбурыць створанае за гады, страціць нашу краіну і будучыя спартыўныя перамогі! Мы хочам абараніць нашу мару — стаць удзельнікам, прызёрам і чэмпіёнам Алімпійскіх гульняў! Для нас — гэта ўсё наша жыццё! Мы ўсе не можам заставацца абыякавымі да лёсу сваёй краіны. Давайце ўспомнім аб сіле спорту, якая аб'ядноўвае!» — рэзюмуецца ў звароце.

Чакаецца, што дакумент у хуткім часе падпішуць многія нацыянальныя каманды па відах спорту, вядомыя спартсмены і атлеты-пачаткоўцы.

**БелТА.**

На слыху

# Еўрапейскім краінам не варта закрывацца на каранцін

## Гэта парэкамендавала Сусветная арганізацыя аховы здароўя

**Кожныя 17 секундаў у Еўропе ад каранавіруса гіне адзін хворы, паведамілі ў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Каб знізіць смяротнасць, варта прытрымлівацца мер перасцярогі і змагацца з дэзынфармацыяй. Пры гэтым такія меры, як лакдаўн або каранцін назвалі «апошнім сродкам».**

— Сусветная арганізацыя аховы здароўя мае даныя пра больш чым 17,1 мільёна выпадкаў каранавіруснай інфекцыі ў Еўропе і амаль 480 тысячах выпадкаў смерці. У лістападзе ў Еўропе выяўлена больш за чатыры мільёны новых выпадкаў захворвання. На мінулым тыдні зарэгістравана звыш 23 тысяч выпадкаў смерці ад COVID-19. Такім чынам, у Еўрапейскім рэгіёне кожныя 17 секундаў памірае адзін хворы з каранавірусам, — заявіў учора **дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Ханс КЛЮГЕ.**

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ўвядзенне каранціну — не найлепшае выйсце.

— Увядзенне ўсеагульнага каранціну — гэта апошні сродак. Яго пажадана пазбегнуць, бо гэта вядзе да адключэння эканомікі, абвастрэння праблем псіхічнага здароўя, злоўжывання алкаголем і псіхаактыўнымі рэчывамі, гендарнага гвалту і парушэння работы асноўных службаў аховы здароўя.

Ханс Клюге падкрэсліў, што многія меры, у тым ліку лакдаўн, былі прааналізаваны пасля першай хвалі.

— Мы многаму навучыліся. Паўсюднае ўвядзенне каранціну негатыўна ўплывае на людзей і эканоміку. Жорсткія меры патрэбны, але мы павінны правільна ацэньваць спадарожны ўрон, — заявіў кіраўнік бюро.

Ён заклікаў не закрываць школы.

— Мы заклікаем працягваць работу школ, асабліва пачатковых. Мы валодаем багатым вопытам барацьбы без уціску дзяцей. Ёсць школы, якія паспяхова працуюць, праводзячы навучанне ў малых групах і павялічваючы фізічную дыстанцыю.




### Ці заразныя бессімптомныя пацыенты?

**Супрацоўнік каардынацыйнага штаба па рэагаванні на пандэмію еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ доктар Алег СТАРАЖЭНКА** расказаў, што вірус выдзяляецца і ў бессімптомных носьбітаў. Праўда, яны заразныя крыху меней — адзін-два тыдні, у той час як пацыент з сярэдняцяжкім цячэннем выдзяляе вірус цягам трох тыдняў, а ў цяжкіх выпадках — яшчэ даўжэй. Найчасцей бессімптомнымі носьбітамі з'яўляюцца дзеці і маладыя людзі.

### Ці можна захварэць другі раз?

**Старшы спецыяліст па пытаннях надзвычайных сітуацый еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Катрын СМОЛВУД** адзначыла, што пакуль дакладных даных няма. На мінулым тыдні было апублікавана даследаванне, у якім сцвярджаецца, што імунны адказ фарміруецца пасля захворвання і доўжыцца месяц.

— Перахварэлі вы ці не, меры перасцярогі выконваць трэба. Хвароба не вызваляе вас ад выканання правілаў прафілактыкі, — падкрэсліла Катрын Смолвуд.

— Нашэнне масак — не панацэя, але іх важна выкарыстоўваць у спалучэнні з іншымі мерамі, — дадаў Ханс Клюге. — Калі ў краінах Еўропы іх выкарыстанне павялічыцца да 70 % (цяпер яно складае каля 50 %), сітуацыя палепшыцца. Усе павінны памятаць, што масавыя сходы патрабуюць асаблівай асцярожнасці.

### Ці выцісне COVID-19 грып?

— Пакуль рана гаварыць, ці знікне грып у гэтым сезоне. Але ў Паўднёвым паўшар'і, дзе грып пачынае цыркуляваць раней, мы бачылі, што меры прафілактыкі супраць COVID-19 аказаліся надзвычай эфектыўныя і супраць грыпу. Цяпер бачым і ў Еўропе зніжэнне цыркуляцыі вірусаў грыпу, — адзначыла Катрын Смолвуд.

### Ці святкаваць Каляды?

— У шэрагу еўрапейскіх краін сітуацыя стабілізуецца і паляпшаецца. Важна яе аналізаваць і прымаць меры на месцах. Тут усё ў руках мясцовых уладаў. Нават калі ў нейкіх рэгіёнах сітуацыя дрэнная, можна прымаць мясцовыя сектаральныя меры, — заявіў Ханс Клюге. — Мы бачым святло ў канцы тунэля. І гэта значыць, што мы не павінны адмаўляцца ад святкавання Каляд.

Але пры гэтым ён заклікаў прымаць меры прафілактыкі — аддаваць перавагу віртуальным мерапрыемствам і святкаванням, заказу ежы на дом, не падвяргаць небяспецы пажылых сваякоў і блізкіх з цяжкімі захворваннямі.

— Хацелі сустрэцца з сябрамі вялікай кампаніяй — адкладзіце гэта да больш бяспечных часоў. Збярыцеся лепш з самымі блізкімі на адкрытым паветры і адзначце свята такім чынам.

**Алена КРАВЕЦ.**

Жыллё

# Будуюць больш у гарадах

**За 10 месяцаў года арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 35,3 тысячы новых кватэр. Як паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт, за гэты час у краіне было ўведзена ў эксплуатацыю 3 млн 80,6 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля.**

Эксперты жыллёвай сферы адзначаюць, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1 млн 176,1 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 38,2 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян-чаргавікоў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 889,8 тысячы квадратных метраў.

Спецыялісты Белстата асобна вылучаюць той факт, што каля дзвюх трацін ад усяго аб'ёму жылля пабудавана ў гарадах. А ў сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 965,3 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 31,3 % ад іх агульнага ўводу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Медыяпрастора

# З любоўю да роднага краю

## Сярод пераможцаў конкурсу, прысвечанага малой радзіме, — прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда»

**Завяршыўся рэспубліканскі творчы конкурс «Пад знакам Года малой радзімы!», вызначаны яго пераможцы. Сёлета СМІ прадставілі 142 работы, сярод якіх 16 — ад рэспубліканскіх, 120 — рэгіянальных і 6 карпаратыўных. Першы намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ расказаў, што праект яшчэ адносна новы, але нягледзячы на гэта да яго назіраецца высокая зацікаўленасць. «Ён закліканы прадэманстраваць дасягненні па зберажэнні і адраджэнні роднага краю, садзейнічаць выхаванню ў моладзі патрыятызму, любові да радзімы і фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі. Упэўнены, такі праект павінен існаваць і далей, развівацца».**

У прыватнасці, дыпломам першай ступені сярод рэспубліканскіх друкаваных СМІ ў намінацыі «Землякі» ўзнагароджаны калектыў рэдакцыі газеты «СБ. Беларусь сегодня», дыпломам другой ступені — наша калега па выдавецкім доме, карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» Наталля Святлова. У намінацыі «Традыцыі і гісторыя роднага краю» дыпломам першай ступені адзначана рэдакцыя «Рэспублікі», дыпломам другой ступені — «Железнодорожник Белоруссии». У намінацыі «У Год малой радзімы — вялікія справы» дыплом першай ступені атрымалі яшчэ адны прадстаўнікі Выдавецкага дома «Звязда» — калектыў часопіса «Маладосць», дыплом другой ступені — «Сельская газета».

Сярод інтэрнэт-рэсурсаў і сеткавых выданняў у намінацыі «Землякі» пераможцам стаў калектыў рэдакцыі «Астравецкай праўды», у намінацыі «Традыцыі і гісторыя роднага краю» дыплом першай ступені атрымаў калектыў аўтараў мультымедыйнага праекта «НеОБЫЧАЙНые деревни» сеткавага выдання SB.BY.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Факт

# АБЯСШКОДЗІЛІ ДЗІКУЮ ЛІСУ

**Удзень у Хойніцкі РАУС паступіла паведамленне ад 82-гадовага жыхара вёскі Судкова. Ён паведаміў, што ў яго на падворку з'явілася ліса, якая паводзіла сябе агрэсіўна.**

Бегаючы па двары, яна забілася ў гаспадарчую пабудову. На месца выбылі супрацоўнікі міліцыі. Прыехаўшы па адрасе і апытаўшы мужчыну, праваахоўнікі прынялі рашэнне застрэліць звера.

У далейшым, як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, ліса была перададзена работнікам ветэрынарнай станцыі для правядзення даследавання на шаленства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Аналітыкі дапусцілі падзенне курса долара на 20 працэнтаў



Курс долара можа знізіцца ў 2021 годзе з-за распрацоўкі новых вакцын ад каранавіруса. Такая ацэнка прыводзіцца ў дакладзе амерыканскай кампаніі Citigroup, вытрымкі з яго апублікавала агенцтва Bloomberg. Як мяркуюць спецыялісты Citigroup, распаўсюджванне вакцын у свеце «будзе азначаць, што ёсць усе прыкметы рынку з тэндэнцыяй да зніжэння» для долара. Курс амерыканскай валюты ў сувязі з гэтым «будзе змяняцца такім жа чынам, як з пачатку да сярэдзіны 2000-х гадоў». У гэты перыяд долар знізіўся ў цане. Як канстатуе агенцтва, распаўсюджванне вакцын паскорыць аднаўленне сусветнай эканомікі і яе вяртанне да росту. Гэта, як мяркуецца, прывядзе да зніжэння цікавасці інвестараў да валют, якія лічацца надзейнымі ў перыяд крызісу. У іх ліку долар і іена. У Citigroup мяркуюць, што падчас нармалізацыі сітуацыі ў сусветнай эканоміцы, а таксама мяккай палітыкі Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША, якая выконвае функцыі цэнтральнага банка краіны, у іншых дзяржавах тэмпы росту могуць быць вышэйшыя, чым у Злучаных Штатах. З-за гэтага, на думку экспертаў кампаніі, цікавасць інвестараў да амерыканскіх актываў можа знізіцца, а да міжнародных — павысіцца.

### Канцэнтрацыя $CO_2$ у атмасферы Зямлі зноў дасягнула рэкордных значэнняў



Запаволенне прамысловай вытворчасці ў сувязі з каранавіруснай пандэміяй не прывяло да прыкметнага скарачэння аб'ёмаў вуглякіслага газу ў атмасферы. Пра гэта сведчаць даныя штогадовага бюлетэня Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) ААН. Агенцтва адзначае, што канцэнтрацыя $CO_2$ працягвала расці. «Скарачэнне выкідаў у сувязі з каранцінам уяўляе толькі невялікую кропку на крывой доўгатэрміновага развіцця», — заявіў генеральны сакратар СМА Петэры Таалас. У бюлетэні сказана, што падчас найбольш значнага прыпынення эканамічнай дзейнасці рэгіструемыя аб'ёмы выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу скараціліся на 17 працэнтаў. У арганізацыі чакаюць, што агульны аб'ём забруджвання паветра сёлета знізіцца на 4—7,5 працэнта, а гэта пакуль не можа прывесці да памяншэння канцэнтрацыі $CO_2$.

### Створана праграма для «перакладу» мяўкання



Інжынер Хаўер Санчэс, які браў удзел у распрацоўцы галасавога памочніка «Алекса» кампаніі Amazon, стварыў праграму для смартфонаў, якая «перакладае» кацінае мяўканне на чалавечую мову. Праграма MeowTalk слухае гукі, якія выдаюцца жывёламі, і спрабуе распазнаць іх значэнне. Гаспадар кошкі, які ўжо добра ведае яе паводзіны і жаданні, таксама можа паўдзельнічаць у стварэнні базы даных мяўкання, якую будзе збіраць штучны інтэлект. Пакуль што праграма абмяжоўваецца 13 кацінымі фразамі, якія ўключаюць у сябе «Пакармі мяне», «Я злы/злая» і «Адчапіся ад мяне». Паводле даных навуковых даследаванняў, у жывёл няма адной зразумелай ім усім мовы. Кожны гук унікальны, у кожнай кошкі — сваё мяўканне. Таму ў праграме няма агульнай базы, яна наладжваецца індывідуальна для кожнага карыстальніка. Праграма запісвае гукі жывёл і індэксуе іх, каб штучны інтэлект змог лепш успрымаць іх голас. Разуменне кошкі будзе паляпшацца па меры выкарыстання праграмы. Па словах Санчэса, у будучыні распрацоўшчыкі спадзяюцца стварыць разумны ашыйнік для кошак, які зможа імгненна перакладаць і агучваць іх мяўканне на зразумелай чалавеку мове. Праграма даступная ў Google Play Store і App Store.

Нашы дзеці

# ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ НЕПАЎНАЛЕТНІХ

## Інфармацыйная бяспека, стыгматызацыя, прадухіленне злачынстваў

**Дзеці асоб без грамадзянства, якія нарадзіліся і пастаянна пражываюць у Беларусі, змогуць пры жаданні і наяўнасці заявы ад бацькоў атрымаць беларускае грамадзянства. Гэты законапраект у другім чытанні быў прыняты напярэдадні Сусветнага дня дзіцяці, 20 лістапада. Пра іншыя правы дзяцей і іх абарону ў краіне падчас прэс-канферэнцыі расказалі спецыялісты.**

### Малыя — самастойныя асобы

Дзяржава прызнае дзяцінства важным этапам жыцця чалавека і зыходзіць з прынцыпаў прыярытэтнасці падрыхтоўкі дзяцей да паўнавартаснага жыцця ў грамадстве, развіцця ў іх грамадска значнай і творчай актыўнасці, выхавання ў іх высокіх маральных якасцяў, патрыятызму і грамадзянскасці, абазначыла прыярытэты **Людміла ЗДОРЫКАВА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

— *У аснову беларускага заканадаўства пакладзены найважнейшыя міжнародныя прававыя дакументы ААН, дзе ўтрымліваюцца асноўныя патрабаванні дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да сям'і і дзяцей. Гэта Дэкларацыя правоў дзіцяці, падпісаная ў 1959-м, і Канвенцыя аб правах дзіцяці ад 1989 года. Згодна з апошнім дакументам, яшчэ ў 1993-м у Беларусі быў прыняты Закон аб правах дзіцяці, які вызначае прававы статус малога як самастойнай асобы і ўстанаўлівае асноўныя гарантыі правоў і інтарэсаў дзяцей,* — растлумачыла дэпутат.

У 1996 годзе ў краіне створана Нацыянальная камісія па правах дзіцяці, якая актыўна ўзаемадзейнічае з псіхолагамі, юрыстамі і грамадскімі арганізацыямі. Склад членаў гэтай камісіі зацвярджаецца кіраўніком краіны.

— *Сярод прыярытэтных задач дзейнасці камісіі — кантроль за захаваннем правоў і інтарэсаў дзяцей, якія замацаваны Канвенцыяй аб правах дзіцяці і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, падрыхтоўка навукова абгрунтаваных прагнозаў і вызначэння стратэгій прадухілення рызык сацыяльна небяспечнага становішча дзяцей і іх мінімізацыя, павышэнне адказнасці бацькоў за выхаванне сваіх дзяцей, зацвярджэнне нацыянальных дакладаў, якія аддаюцца на разгляд у Камітэт па правах дзіцяці, створаны ў адпаведнасці з Канвенцыяй,* — акрэсліў **Анатоль ГЛІНСКІ, загадчык лабараторыі праблем выхавання асобы навукова-даследчага цэнтра «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі.**

### Асабістыя даныя пад аховай закона

У 2017-м Закон аб правах дзіцяці дапоўнілі главой «Абарона дзяцей ад інфармацыі, якая наносіць шкоду іх здароўю і развіццю», дзе абазначана, у прыватнасці, якія звесткі здольныя стаць шкоднымі для фізічнага, маральнага і духоўнага развіцця малых у пэўных узроставых катэгорыях. А таксама акрэслены ўмовы распаўсюджвання прадукцыі і аказання шэрагу паслуг па доступе да інфармацыі.

— *У прыватнасці, устаноўлена забарона на распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі інфармацыйнай прадукцыі, у тым ліку створанай за межамі краіны, якой не прысвоены знак узроставай катэгорыі, за выключэннем выпадкаў, калі наяўнасць такога знака для прадукцыі не абавязковая. Створаны грамадска-кансультатыўны савет па абароне дзяцей ад інфармацыі, якая прычыняе шкоду іх здароўю і развіццю,* — заўважыла **Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.** — *1 снежня 2018 года ўступілі ў сілу папраўкі да Закона аб СМІ. Забаронена распаўсюджваць інфармацыю аб непаўналетніх, якія пацярпелі ў выніку супрацьпраўных дзеянняў ці бяздзеяння (іх прозвішча, імя, імя па бацьку, фота- і відэавыявы малых, іх бацькоў ці законных прадстаўнікоў, аўдыязапіс голасу, дату нараджэння, месца жыхарства, вучобы ці работы). Любыя звесткі, якія прама ці ўскосна могуць дапамагчы ўстанавіць асобу непаўналетняга, можна распаўсюджваць толькі са згоды законных прадстаўнікоў пацярпелых малых.*

Забаронена таксама распаўсюджваць інфармацыю аб спосабах стварэння выбуховых прылад і выкарыстання гаручых рэчываў, звесткі, скіраваныя на прапаганду вайны ці экстрэмісцкай дзейнасці, парнаграфіі, насілля і жорсткасці, у тым ліку той інфармацыі, што падахвочвае да самазабойства.

### Крадзяжы і флікеры

Не абышлі ўвагай і тэму злачыннасці дзяцей. За апошняе дзесяцігоддзе падлеткавая злачыннасць зменшылася больш як у чатыры разы — з 5,5 тысячы да 1,5 тысячы выпадкаў на год. Сёлета на 20 % знізілася колькасць падлеткавых злачынстваў, а колькасць непаўналетніх, прыцягнутых да адміністрацыйнай адказнасці, зменшылася амаль удвая. Змяніўся таксама і вектар супрацьпраўных дзеянняў, расказаў **Васіль ДЗЕМІДОВІЧ, старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела па арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх Міністэрства ўнутраных спраў:**

— *Значна ўзрасла колькасць злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і крадзяжоў з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі. Аднак амаль палова злачынстваў, якія здзяйсняюцца дзецьмі, як і раней, — крадзяжы. Прычым цяпер гэта робяць не толькі малыя з сем'яў, якія лічацца нешчаслівымі. Прадметы крадзяжу розныя: ад аўтазапчастак і гаручазмазачных матэрыялаў да мабільнікаў і прадуктаў харчавання.*

Змяняюцца і падыходы да арганізацыі прафілактычнай работы з падлеткамі. У 2017 годзе ў Закон «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх» унесены шэраг змен. Яны дазваляюць перш за ўсё выключыць празмерную стыгматызацыю дзяцей і ўдзяляць больш увагі тым, хто можа здзейсніць сур'ёзныя правапарушэнні, правільна расстаўляць прыярытэты, удакладніў ён.

— *Так, было выключана паняцце «ўлік», устаноўлены мінімальны ўзрост, з якога праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, — дзесяць гадоў. Акцэнт органы ўнутраных спраў зрабілі ў бок грамадска небяспечных правапарушэнняў. За такія нязначныя парушэнні, як пераход дарогі ў неабазначаным месцы ці знаходжанне без флікера, індывідуальныя прафілактычныя размовы не прадугледжаны.*

### Абарона ад сваякоў і крымінальнай адказнасці

Важнай задачай у органах лічаць і абарону дзяцей ад супрацьпраўных замахаў, якія часта сыходзяць ад самых блізкіх. Штогод у краіне больш за сем тысяч непаўналетніх прызнаюцца пацярпелымі ад злачынных замахаў, і гэтая колькасць за апошнія пяць гадоў амаль не мяняецца. 70 % з іх — дзеці, якія пацярпелі ў выніку ўхілення бацькоў ад утрымання непаўналетніх або ад пакрыцця расходаў, якія выдаткоўваюцца на ўтрыманне малых, што знаходзяцца на дзяржаўным утрыманні.

— *Летась зарэгістравана 127 выпадкаў насілля ў быце, у тым ліку сексуальнага, у дачыненні да дзяцей. Сёлета такіх злачынстваў ужо 86,* — удакладніў прадстаўнік МУС. — *Улічваючы латэнтнасць гэтай праблемы, мы праводзім неабходную інфармацыйна-тлумачальную работу, ранняе выяўленне дрэннага сямейнага становішча, насілля ў дачыненні да дзяцей. У краіне працуе тэлефонная лінія — 8-017-372-73-87 — па пытаннях дрэннага сямейнага становішча, якая створана МУС.*

Дзякуючы супрацоўніцтву з Дзіцячым фондам ЮНІСЕФ у галіне прафілактыкі правапарушэнняў запушчаны інфармацыйны рэсурс http://kids.pomogut.by/. Гэты сайт створаны з мэтай прадухілення супрацьпраўных паводзінаў непаўналетніх і аказання дапамогі дзецям, якія ўжо знаходзяцца ў канфлікце з законам.

— *Крымінальныя нормы ў дачыненні да непаўналетніх таксама маюць сваю спецыфіку,* — падкрэсліў падпалкоўнік міліцыі. — *У Крымінальным кодэксе існуе шэраг артыкулаў, дзе вызначаецца прававы статус падлеткаў на розных стадыях крымінальнага працэсу. Мы прапануем пашырыць падставы для вызвалення дзяцей ад крымінальнай адказнасці. Вызваленне гэтай катэгорыі ад крымінальнай адказнасці — спецыяльны від вызвалення, які базіруецца на наяўнасці магчымасці выпраўлення падлетка без прыцягнення яго да крымінальнай адказнасці.*

Пакуль канцэпцыя ўдасканалення юстыцыі для непаўналетніх у Беларусі працягвае распрацоўвацца.

**Ірына СІДАРОК.**

# Гараж. Некамедыя

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зусім нядаўна такое адбылося ў масіве на вуліцы Аўтамабілістаў. Успыхнулі перагародкі паміж некалькімі гаражамі, праз што абрынуліся дахі. Гаспадар аднаго з іх толькі цудам не пацярпеў. Чаго не скажаш, аднак, пра маёмасць, бо было пашкоджана шэсць гаражоў і сем аўтамабіляў.

А вось у Заводскім раёне ўсё скончылася сапраўды трагічна. Раніцай 19 мая выратавальнікам стала вядома, што ў прыватным сектары гарыць цагляны гараж. Агонь ахапіў і драўляную абшыўку пастаўленай побач пуні. Супрацоўнікі выратавальнай службы знайшлі мужчыну ў непрытомным стане. На месцы была «хуткая», але рэанімаваць небараку не ўдалося — медыкі канстатавалі смерць. Пазней аказалася, што гаспадар дазволіў знаёмаму пажыць у гаражы некаторы час, а той праявіў сябе не з лепшага боку. Прычынай трагедыі стала неасцярожнасць падчас курэння...

— Наколькі моцна павялічваюць пажарную нагрузку каністры з палівам, якія часам знаходзяцца ў гаражах? — пытаемся ў спецыяліста.

— Паказальны выпадак адбыўся ў гаражным масіве на ўскрайку Мінска. Дастаткова сказаць, што плошча пажару склала 24 квадратныя метры, сам гараж быў моцна закураны, а дах месцамі абваліўся. Пасля высветлілася, што гаспадар з нейкай мэтай выкарыстоўваў адкрыты агонь. І калі полымя выйшла з-пад кантролю, то кіроўца спрабаваў як мага хутчэй вывесці адтуль аўтамабіль. 59-гадовы мужчына атрымаў апёкі 7 % паверхні цела і быў шпіталізаваны. Пасля ў гаражы былі знойдзены каністры і нават прымус.



У МНС прыгадваюць яшчэ адзін пажар у гаражы, які адбыўся ў глыбінях прыватнага сектара ў Цэнтральным раёне Мінска. Аднойчы ён ужо трапляў у зводкі службы МНС — у канцы 2015 года. Тады агонь пашкодзіў там легкавы аўтамабіль. І вось праз пяць гадоў у тым наваколлі ізноў давялося тушыць полымя. На гэты раз мужчына са сваім сынам і сябрам праводзілі рамонтныя работы. Нешта пайшло не так, і загарэлася маёмасць у гаражы. Істотныя пашкоджанні атрымалі два легкавікі, тры чалавекі пацярпелі. У аднаго з іх было дыягнаставана 20 % апёкаў паверхні цела.

Пры гэтым патушыць пажар у гаражным масіве не заўсёды проста. На дадзены працэс уплывае ступень складанасці праезду да месца падзей. Адна справа, калі нешта падобнае адбываецца ў сектары прыватнай забудовы, дзе кожны дом мае свой адрас, і зусім іншая — на прасторы, дзе адначасова месцяца сотні аднолькавых гаражоў. Да таго ж планіроўка і схемы могуць не адпавядаць рэчаіснасці.

— Разам з тым магчыма паспрыяць таму, каб урон ад узгарання аказаўся як мага меншы. Канешне ж, мець пры сабе вогнетушыцель вялікага аб'ёму. У аўтамабілі ён мусіць быць абавязкова, — адзначае Вольга Мельчанка. — У выпадку невялікага пажару можна паспрабаваць патушыць яго самастойна, але калі змаганне няроўнае, то трэба тут жа выклікаць ратаўнікоў. А пакуль яны будуць ехаць, трэба не правакаваць яшчэ большае разгаранне. Таму трэба шчыльна зачыніць дзверы і, калі ёсць сувязь з вартаўніком, паведаміць яму канкрэтныя звесткі, каб пасля не марнаваўся час на пошукі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Рэктар Магілёўскага дзяржуніверсітэта Дзяніс ДУК:

# «У нас свае асаблівасці і шлях развіцця ў сусветнай гісторыі»



**Тры гады таму Дзяніс Дук пераехаў у Магілёў, каб узначаліць вядучую ВНУ вобласці па падрыхтоўцы педагагічных кадраў. Дзеля гэтага прыйшлося развітацца з роднай альма-матар у Полацку, дзе прайшло яго станаўленне як археолага і вучонага. Там засталіся вучні, калегі, сябры, археалагічныя таямніцы, якія яшчэ не раскрытыя і чакаюць свайго часу. Але ў Магілёве за зусім кароткі час былы прарэктар Полацкага дзяржуніверсітэта стаў сваім чалавекам. Ён развівае навуку, вядзе актыўную грамадскую дзейнасць, каардынуе выхаваўчы працэс. І ў гэтым вельмі шчыльным працоўным графіку ён знайшоў час, каб расказаць пра археалогію, навацыі, навуковыя падыходы ў рабоце, а заадно падзяліцца сваімі думкамі наконт выхавання асобы, значэння літаратуры ў жыцці чалавека і ролі сям'і. Наш суразмоўнік адзін з аўтарытэтных археолагаў Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар, уладальнік медаля Францыска Скарыны.**

***— Дзяніс Уладзіміравіч, што за гэтыя тры гады кардынальна змянілася ў вашым жыцці, і што грунтоўнага вы паспелі зрабіць на пасадзе рэктара МДУ?***

— Магілёў вельмі адметны цэнтр на тэрыторыі Беларусі — сваімі традыцыямі, ментальнасцю, непаўторным каларытам. У мяне раней архетыпам максімальна захаванага гістарычнага ландшафту былі Полацк і Гародня, але Магілёў у гэтым ланцужку займае ці не першае месца. Тут сапраўды захаваўся гістарычны ландшафт і аўра беларускага горада. Жыхары вылучаючца сваёй шчырасцю, адкрытасцю, шчодрасцю. Паўночныя людзі з той жа Віцебскай вобласці больш нардычнага складу, і гэты кантраст вельмі кідаецца ў вочы. Сувязь з полацкай альма-матар між тым працягваецца. З такім жа поспехам вяду супрацоўніцтва з калегамі з іншых ВНУ. Разам вырашаем арганізацыйныя і навуковыя пытанні, абменьваемся вопытам. За гэты час пры ўніверсітэце створаны Савет па абароне дысертацый па спецыяльнасці «айчынная гісторыя», у які ўваходзяць дактары навук з нашага ўніверсітэта і ўніверсітэтаў іншых абласцей. Адкрыта шмат іншых спецыяльнасцяў, якія вельмі запатрабаваныя. Сёлета ўпершыню адбыўся набор студэнтаў на спецыяльнасць «праграмнае забеспячэнне і камп'ютарныя тэхналогіі» — першую інжынерную ва ўніверсітэце. Ствараем пад яе сучасную лабараторыю з камп'ютарным і мультымедыйным абсталяваннем, умацоўваем матэрыяльную базу. Гэта дазволіць ажыццяўляць дыстанцыйны працэс навучання, арганізоўваць анлайн-масты з іншымі навучальнымі ўстановамі. Адкрылі набор на медыкабіялагічную справу, некалькі іншых не менш запатрабаваных спецыяльнасцяў. І далей будзем працаваць у гэтым кірунку. Мы ідзём за рынкам працы, а ён дыктуе свае патрабаванні. Дасягненнем нашага калектыву лічу і тое, што да нас стала прыязджаць больш замежных студэнтаў, павялічылася дыверсіфікацыя нашых паслуг. Гэта значыць, што адукацыя становіцца больш запатрабаваная.

***— Дзякуючы археолагам адкрываюцца новыя факты, якія часам цалкам мяняюць уяўленне аб месцы народа ў сусветнай гісторыі. Што трэба для таго, каб галіна гэтай гістарычнай навукі дынамічна развівалася?***

— Гэта навука трымаецца на асобах, паколькі патрабуе не толькі навуковых кампетэнцый, але і арганізатарскіх здольнасцяў. Арганізаваць раскопкі вельмі складана ва ўсіх сэнсах. Полацку, напрыклад, пашчасціла. Там быў створаны калектыў археолагаў, які сёння паспяхова працуе. Дзякуючы археолагам праводзіцца рэстаўрацыя Спаса-Праабражэнскай царквы праваслаўнага Спаса-Ефрасінеўскага манастыра, помніка дойлідства XII стагоддзя, які пабудавала Ефрасіння Полацкая. Я стаяў ля вытокаў вывучэння гэтай царквы. Зараз там працягваюць работу мае былыя студэнты, вучні, а цяпер калегі. Вядуцца раскопкі на Верхнім замку ў Полацку, дзе адбываецца рэканструкцыя карпусоў былой гарадской бальніцы. У будучым яна будзе прыстасавана для грамадскіх патрэб.

Калектыў археолагаў нашага ўніверсітэта таксама прыкметны на ўзроўні краіны. Па колькасці археолагаў магілёўскі ўніверсітэт не мае роўных сярод навучальных устаноў Беларусі. У нас ёсць спецыялісты па каменным веку, познім жалезным веку, Сярэднявеччы, нават па археалогіі Новага часу. Гэта як маладыя крэатыўныя людзі, так і вопытныя настаўнікі, накшталт Якава Рыера, Ігара Марзалюка. Справа археалогіі ў МДУ на такой урадлівай глебе павінна развівацца і далей.

***— А які раён у Магілёўскай вобласці найбольш перспектыўны з пункту гледжання археолага?***

— Памятаеце пра нашумелыя знаходкі ў Бабруйску — шлема, рэшткаў даспехаў дружынніка і атрыбутаў ваеннай культуры? Бабруйскі раён зусім яшчэ не даследаваны ў плане гістарычнай тапаграфіі. Пакуль у нас ёсць толькі агульныя ўяўленні пра тое, як горад развіваўся. Але гэтыя рэдкія знаходкі сведчаць, што роля Бабруйска ў пачатковай гісторыі дзяржаўнасці на Беларусі была не апошняя. Гэта быў, як кажа Ігар Марзалюк, адзін з ранніх цэнтраў княжання, які ўваходзіў у сферу інтарэсаў князёў полацкіх. Той жа шлем, які там знойдзены, мог належаць і князю, і князеваму дружынніку. Асабіста мне цікава, якая тут сувязь можа быць з Полацкай зямлёй, цэнтрам нашай сярэднявечнай дзяржавы. І я буду рады, калі мой вопыт спатрэбіцца ў вывучэнні і самога Полацка, дзе я часта бываю і па-ранейшаму курырую раскопкі ў Спаскай царкве.

***— Ваша сумесная работа з прафесарам Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вольгай Ляўко «Выток беларускай дзяржаўнасці: Полацкая і Віцебская землі ў IX— XVIII стагоддзях» была высока ацэнена на дзяржаўным узроўні. Асновай сталі вашы навуковыя адкрыцці, якія вы здзейсніілі падчас работы над кандыдацкай і доктарскай дысертацыямі. Што больш за ўсё цікавіла вас у гэтых даследаваннях?***

— Мяне цікавіла і цікавіць уся гісторыя ад пачатку да сённяшняга дня. Мая кандыдацкая дысертацыя была прысвечана матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI— XVIII стагоддзяў, а доктарская ахоплівала ўсе перыяды. Раней пагружэнне ў праблематыку XVI— XVIII стагоддзяў лічылася ледзь не сучаснасцю па археалагічных мерках, і археолагі гэты перыяд не чапалі. Але ён цікавы тым, што менавіта ў гэты час адбываецца фарміраванне беларускай народнасці і, як следства працэсу, нацыі. А старажытнасць цікавая тым, што дае адказ на пытанне, адкуль наш род пачаўся. На археалагічным матэрыяле атрымалася паказаць, якая была роля Полацка ў дзяржаватворчых працэсах Беларусі. Былі адметнасці, якія даказалі, што мы такія ж старажытныя, як Кіеў і Ноўгарад. І нават, можна сказаць, што мы вельмі адрозныя ад гэтых цэнтраў. Гэта адрозненне з'яўляецца нашай яскравай рысай на той перыяд, калі беларусаў і блізка не было, а былі вялікія славянскія супольнасці. Крывіцкі Полацк развіваўся па цікавай схеме, непадобнай да схемы развіцця Кіева і Ноўгарада. І мы гэта паказалі. У нас наогул вельмі багатая на падзеі гісторыя. Тое славянскае насельніцтва, якое выбрала сваім месцам пражывання беларускае Падзвінне, з такімі цэнтрамі, як Віцебск, Полацк, Лукомль, а гэта былі крывічы, стварыла цуд пад назвай Полацкая зямля, а яна ў сваю чаргу стварыла такі цуд, як Вялікае Княства Літоўскае. Таму што аснова ВКЛ — гэта тая прававая сістэма, той лад, які шмат у чым быў характэрны для Полацкай зямлі. Шмат што ў дзяржаўным укладзе ВКЛ было перанятае з тых дасягненняў, якія належалі прадстаўнікам Полацкай зямлі. А ВКЛ — гэта ўжо час фарміравання беларускай народнасці, сама нацыя з'явілася крыху пазней.

***— Неяк вы сказалі, што выкладчык не павінен напіхваць студэнта ведамі, ён павінен навучыць яго здабываць іх самастойна. Падзяліцеся сакрэтам, як гэтаму можна навучыць?***

— Выкладчык — гэта чалавек, які натхняе, дапамагае. Калі выкладчык сфарміраваўся як творчая, высокамаральная асоба, яму ёсць чым студэнта зацікавіць, нават уласным прыкладам і ўласнымі навуковымі здабыткамі. А цікаўны студэнт заўсёды знойдзе час падысці да выкладчыка і пракансультавацца. І добры выкладчык ніколі яму не адмовіць, не скажа: мне не да цябе зараз, заняткі ўжо скончыліся, бывай. Я заўсёды пытаюся ў сваіх студэнтаў, хто для іх цікавы, хто дае ім шмат карыснага матэрыялу, хто натхняе. І яны, як правіла, называюць канкрэтныя прозвішчы. Будучы даверанай асобай кандыдата ў Прэзідэнты падчас выбараў, а зараз ужо кіраўніка дзяржавы, я аб'ездзіў усе рэгіёны Магілёўскай вобласці. І мяне ўразіла, што амаль у кожным раёне да мяне падыходзілі выпускнікі Магілёўскага ўніверсітэта розных гадоў, пыталіся пра сваіх былых настаўнікаў і дзякавалі ім. Яны ўжо самі дабіліся поспехаў у настаўніцкай справе і іншых сферах, натхнілі сваім прыкладам не аднаго вучня, а ў душы гарыць той агеньчык, які ў іх запаліў настаўнік з вялікай літары. Гэтая сувязь з настаўнікам, спачатку школьным, потым універсітэцкім, дарагога вартая.

***— Кажуць, што ўсё пачынаецца з дзяцінства. І першыя нашы настаўнікі — гэта бацькі. Якія асноўныя прынцыпы выхавання вы засвоілі?***

— Мой бацька быў ветэранам вайны. У 16 гадоў пайшоў у партызаны, быў узнагароджаны баявым медалём «За адвагу». Працаваў у розных сферах, яго шмат хто ў Наваполацку ведаў і памятае. Тры гады таму пайшоў з жыцця. Але менавіта з яго пачалася мая любоў да гісторыі, з яго расказаў пра малую радзіму — Ушаччыну, з яго легендаў і паданняў пра валатоўкі, як там называюць курганы. Ён быў вельмі начытаны чалавек, быў знаёмы з Рыгорам Барадуліным. У нас дома мелася багатая бібліятэка, і я перачытаў усе кнігі, якія там былі. А Уладзіміра Арлова адкрыў для сябе, калі мне было 10-12 гадоў. Настаўнік гісторыі параіў схадзіць на сустрэчу з пісьменнікам у кнігарню, і я пабег. Дагэтуль захоўваю яго кнігу «Дзень, калі ўпала страла» з аўтографам «Шаноўнаму Дзянісу Дуку з пажаданнем ведаць гісторыю роднай Беларусі». З аўтараў, якіх сёння чытаю, падабаецца англійскі пісьменнік Джон Фаўлз. Можна бясконца перачытваць Чэхава, Караткевіча, братоў Стругацкіх і іншых аўтараў. Чытаю кнігі і ў папяровым, і ў электронным выглядзе, хоць друкаваны варыянт падабаецца больш. Шмат чаго цікавага можна знайсці ў інтэрнэце. «Вялікі Гэтсбі» і «Ноч пяшчотная» Фіцджэральда чытаў раней, а зараз адкрыў для сябе некалькі новых яго твораў.

***— Што з бацькоўскага вопыту выкарыстоўвалі для выхавання сваіх сыноў?***

— Гэты працэс працягваецца. Кожны чалавек — асоба, са сваімі інтарэсамі і захапленнямі. І калі інтарэсы бацькоў і дзяцей розныя, не трэба з гэтага рабіць трагедыю. Трэба заахвочваць тое, чым цікавіцца дзіця. Для некаторых трагедыя, калі сын не пайшоў па слядах бацькі, не працягнуў сямейную справу. Але не гэта галоўнае. Галоўнае, каб сын або дачка былі добрымі людзьмі. І калі яны будуць такімі, то месца ў гэтым жыцці знойдуць.

***— Як праводзіце час з сям'ёй? Ці ёсць нейкія сямейныя традыцыі?***

— Ходзім з жонкай у Магілёўскі драмтэатр. У Беларусі мала тэатраў такога ўзроўню і з такой гісторыяй. Гэтую гісторыю адчуваеш, калі знаходзішся ў ложы, у якой сядзеў калісьці імператар Мікалай II. Кажуць, праўда, што ён у тэатры фільмы глядзеў. Але ж антураж усё роўна захаваўся. І архітэктура, і аўра, і калектыў, і пастаноўкі — усё робіць уражанне. Не было ніводнага спектакля, які пакінуў бы раўнадушным. Двойчы хадзілі з жонкай на камедыю «Тарцюф» — уразіла вельмі моцна. Цікавая пастаноўка «Рамантыкі». А яшчэ ўсе мы — я, жонка, дзеці — любім гатаваць. У кожнага свая адметнасць. На мне рыбныя стравы. Жонка займаецца гатаваннем усяго і выпечкай, у яе наогул усё смачнае. Малодшы сын сам прыдумвае стравы з замарожанай агароднінай, яйкам, сырам і іншымі сакрэтнымі інгрэдыентамі. Робіць хутка, атрымліваецца вельмі смачна і сытна.

***— Вы і кіраўнік, і выкладчык, і грамадскі дзеяч — усё гэта патрабуе шмат часу. Ад чаго прыходзіцца адмаўляцца?***

— Не хапае як раней часу на навуку, хоць я працягваю ёю займацца. Але прыходзіцца адмаўляцца ад палявых археалагічных даследаванняў. Затое хапае назапашанага археалагічнага матэрыялу, які трэба апрацаваць.

***— Сёння ўсё часцей даводзіцца чуць, што газеты аджылі сваё, будучае — за інтэрнэтам. Вы таксама гэтак лічыце?***

— Газету люблю за тое, што ў ёй можна пачытаць добрую аналітыку. У гэтым яна выгадна адрозніваецца ад іншых крыніц. Навіна з'яўляецца ў інтэрнэце хутка, а аналітыка, меркаванне тых ці іншых людзей, падрабязнасці пра тую ці іншую падзею робяць газету цікавай. Сёння я даю інтэрв'ю, можа нехта пачытае, натхніцца і пажадае стаць навукоўцам або даследчыкам. У гэтым і ёсць сутнасць газеты.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**информирует о проведении 17.12.2020 повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Могилевоблавтотранс»**

<u>Лот № 1:</u> **капитальное строение с инв. № 700/С-9526 – шиномонтажное отделение**, площадь – 391,6 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание шиномонтажного отделения с асфальтобетонным покрытием. Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, Челюскинцев, 172И, на земельном участке с кадастровым номером 740100000003007138.

**Начальная цена продажи:**
**91 800,00 бел. рубля с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 9 180,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 17 декабря 2020 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

***Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 24.04.20, 16.06.20, 01.08.20.***

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

---

В **суд Дрогиченского района Брестской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим МИХНОВЦА Николая Леонтьевича, 29 октября 1967 года рождения, уроженца деревни Гурка Дрогиченского района Брестской области, зарегистрированного в агрогородке Закозель Дрогиченского района, ул. 8 Марта, д. 1, судимого за мошенничество, работавшего в СП «Санта-Бремор», имеющего многочисленные долги, проживавшего до 2016 года: г. Брест, ул. Советской Конституции, д. 25, комн. 34 с супругой Михновец Людмилой Леонидовной.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Михновце Николае Леонтьевиче, сообщить их суду Дрогиченского района Брестской области в течение двух месяцев с момента публикации данного объявления.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 24 декабря 2020 года проводит 21-<u>й</u> открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи *(бел. руб.)* | Сумма задатка *(бел. руб.)* |
|---|---|---|---|---|
| 217 | KAMAZ 4310 грузовой бортовой тентовый, 1985 г., кузов (рама) № 16014, рег. № АК 0386-2, *пробег 79970 км* | г. Витебск, ул. Гагарина, 48 | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 218 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ, ш. 6Д9108003, дв. 06911, 1991 г., *4 кат., 31473 км, КР-03.2009* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 34 000,00 | 6 800,00 |
| 219 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ, ш. 498007019, дв. 637156, 1980 г., *4 кат., 3810 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 38 000,00 | 7 600,00 |
| 220 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ, ш. 508811007, дв. 8846024, 1988 г., *4 кат., 1976 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000,00 | 8 000,00 |
| 221 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ, ш. 508811006, дв. 8834678, 1988 г., *4 кат., 2500 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 39 000,00 | 7 800,00 |
| 222 | Специальный автомобиль ГАЗ-66-15 с кузовом-фургоном КМ-66 из-под радиостанции Р-140-0,5 в составе: Автошасси ГАЗ-66-15 (Р-140-0,5), ш. XTH006615L0609780, рег. № б/н, 1990 г., *пробег 402 км,* кузов-фургон КМ-66, 1990 г. | г. Могилев, Областное УМЧС | 8 050,00 | 1 610,00 |
| 223 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном КМ-66 из-под радиостанции Р-140-0,5 в составе: автошасси ГАЗ-66-15 (Р-140-0,5), ш. XTH006615K0587371, рег. № ТЕ 8169, 1989 г., *пробег 2121 км,* кузов-фургон КМ-66 1989 г. | г. Могилев, Областное УМЧС | 8 050,00 | 1 610,00 |
| 224 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108703038, дв. 046084, 1987 г., *4 кат., 2426 км* | г. Минск, в/ч 63615 | 56 000,00 | 11 200,00 |
| 225 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108405019, дв. 868053, 1984 г., *4 кат., 2047 км* | г. Минск, в/ч 63615 | 56 000,00 | 11 200,00 |
| 226 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное), ш. 108606014, дв. 823330, 1986 г., *4 кат., 6005 км* | г. Минск, в/ч 63615 | 55 000,00 | 11 000,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 24 декабря 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 21 декабря 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **24 декабря 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона**.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. <u>Без НДС</u>.

Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

| Лот | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 А5; год выпуска – 2009; регистрационный знак – AI 4937-5; кузов (VIN) № – Y3M6303A590001285 | 11676,00 | 1167,60 | 583,80 |
| 2 | Грузовой бортовой МАЗ 53371; год выпуска – 1996; регистрационный знак – AI 6711-5; кузов (VIN) № – Y3M533710T0016457 | 2184,00 | 218,40 | 109,20 |
| 3 | Грузовой специальный самосвал GAZ-SAZ 3507; год выпуска – 1991; регистрационный знак – 6189 АР-5; кузов (VIN) № – XTH330720M1438750 | 1344,00 | 134,40 | 67,20 |
| 4 | Легковой седан OPEL OMEGA; год выпуска – 1998; регистрационный знак – 6481 ОАА; кузов (VIN) № – W0L0VBM69W1022496 | 1008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 5 | Прицеп тракторный ПСЕ; год выпуска – 1991; регистрационный номер – БН; кузов (VIN) № – БН | 520,80 | 52,08 | 26,04 |
| 6 | Прицеп тракторный ПСЕФ-12 БС; год выпуска – 1993; регистрационный знак – БН; кузов (VIN) № – БН | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 7 | Прицеп тракторный 2ПТС-4; год выпуска – 2000; регистрационный знак ОВ-5 2380; кузов (VIN) № – БН | 1428,00 | 142,80 | 71,40 |
| 8 | Мотоцикл ММВЗ 3.1134 Лесник; год выпуска – 2007; регистрационный знак – 1734 АА-5; кузов (VIN) № – 70000260 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 9 | Погрузчик ковшовый Сталева Воля; год выпуска – 1997; регистрационный знак – нет; кузов (VIN) № – БН | 18228,00 | 1822,80 | 911,40 |
| Лоты №№ 1–9 расположены по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, вблизи п. Чисть | | | | |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся третьи повторные торги. Стоимость с учетом снижения на 30 %.
Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 121 от 24.06.2020 стр. 4, № 171 (29285) от 03.09.2020 стр. 14, № 204 от 20.10.2020 стр. 11.
На сайте https://bankrot.gov.by/ извещение № 00053476, № 00056359, № 00058089

| Лот | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 10 | Машина разрывная МР-500 (20-500) кН | 4752,00 | 475,20 | 237,60 |
| 11 | Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 630/С-62355, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад нефтепродуктов (с составными частями и принадлежностями). Полный перечень см. на сайте https://orgtorg.by | 76478,40 | 7647,84 | 3823,92 |
| Лот № 10 расположен по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 1, вблизи п. Чисть<br>Лот № 11 расположен по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, 1 | | | | |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся четвертые повторные торги. Стоимость с учетом снижения на 40 %.
Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 95 от 19.05.2020 стр. 14, № 140 от 22.07.2020 стр. 4, № 171 (29285) от 03.09.2020 стр. 14, № 204 от 20.10.2020 стр. 11
На сайте **https://bankrot.gov.by/** извещение № 00054671, 00052430, № 00056359, № 00058089

**УСЛОВИЯ АУКЦИОНА И КРИТЕРИИ ВЫЯВЛЕНИЯ ПОБЕДИТЕЛЯ**

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Аукцион проводится до наиболее высокой цены предмета аукциона. Аукционист объявляет участника, предложившего более высокую цену за предмет аукциона, трижды повторяет последнюю цену и при отсутствии надбавок объявляет о том, что имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Данный участник получает статус «Претендент на покупку» и на него распространяются правила и условия, установленные законодательством для победителя аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов.**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Начало приема заявлений в 10.00 25.11.2020 г. Окончание приема заявлений в 16.00 08.12.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

**Аукцион по лотам состоится 09.12.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/**с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.» **Срок внесения задатка: с 10.00 25.11.2020 г. по 16.00 08.12.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами аукциона. Контактное лицо для осмотра Предметов: 8 029 303 18 05 (Новоселов Дмитрий Викторович).

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону 8 (029) 171 09 46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

**Снятие с гос. учета предмета торгов осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет.**

**Государственная регистрация договора купли-продажи объектов недвижимости, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.**

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121:**<br>**☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-консультант»**<br>**☎ +375 (29) 698-51-76, +375 (29) 502-77-77, +375 (29) 392-89-06, +375 (17) 395-58-13** |

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **МОАО «Красный металлист», Могилевская обл., г. Могилев, Гомельское шоссе, д. 15а** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов:**
**оборудование, бывшее в употреблении.**
**Местонахождение: г. Могилев, Гомельское шоссе, 15а**

| № лота | Наименование | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Пресс однокривошипный КД-2326, инв. № 409-174 | 900,00 |
| 2 | Станок настольно-сверлильный 2М112, инв. № 41-879 | 210,00 |
| 3 | Станок токарный 1А616, инв. № 41-3406 | 780,00 |
| 4 | Станок инструментально-фрезерный 675 ПФ1, инв. №, инв. № 41-1032 | 1 080,00 |
| 5 | Станок фрезерный, инв. № 44-1097 | 780,00 |
| 6 | Станок фуговальный, инв. № 44-732 | 660,00 |
| 7 | Электротельфер ТЭЗ-511, инв. № 41-2111 | 600,00 |
| 8 | Электроперфоратор ИЭ 4707, инв. № 60-3392 | 840,00 |
| 9 | Станок профилешлифовальный 395М, инв. № 40-61 | 1 440,00 |
| 10 | Станок настольно-сверлильный 2М112, инв. № 41-884 | 210,00 |
| 11 | Кран-балка однопролетная L-12м | 1 800,00 |
| 12 | Швейная машина 1022М | 57,00 |
| 13 | Ларь холодильный Carabell, инв. № 45-3227 | 174,00 |
| 14 | Посудомоечная машина HT 11ECO, инв. № 45-1804 | 1 380,00 |
| 15 | Прилавок холодильный, 2 полки, ПВВ (Н)-84К-1, инв. № 45-3541 | 558,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на **5 %**) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 09.11.2020

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **11.00 07.12.2020**.
Окончание торгов: **12.00 07.12.2020**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **03.12.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# НАВОШТА Ў ХАЛАДЗІЛЬНІКУ СІНЯЯ ЛЯМПАЧКА

## Якія нашы звычкі шкодзяць здароўю і знішчаюць імунітэт?

**Нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гурбаніджад Гумен ГУШАНГ кажа, што чалавек у пэўны момант свайго жыцця быццам бы націскае кнопку самазнішчэння. Мы злоўжываем цыгарэтамі і алкаголем, цукрам і шкоднай ежай, ігнаруем сігналы свайго арганізма і рэкамендацыі ўрача... Што мы робім няправільна і чаму гэта прымусіць нас пашкадаваць праз пару дзясяткаў гадоў, расказаў спецыяліст.**



***— Гумен, чаму мы самі часта псуём сваё здароўе? Курым, ведаючы, што гэта выклікае той жа рак лёгкіх, злоўжываем алкаголем?***

— Мы ў жыцці шмат чаго робім, што пагаршае наша здароўе — або адразу, або ў аддаленай перспектыве. Калі прыходзіць пацыент, важна дабрацца да прычыны яго хваробы. Калі баліць галава, можна прыняць аспірын, і боль пройдзе. Але калі яна баліць ад высокага ціску, то гэта ўжо няправільнае лячэнне. Калі доктар дабярэцца да прычыны хваробы, хоць гэта і вымагае больш часу, тады лячыць прасцей. Калі размаўляем з пацыентам, часта вяртаемся на 20—30 гадоў таму. І я тлумачу, што хвароба — наступства вашых тагачасных дзеянняў.

І тут пацыенты падзяляюцца на дзве групы. У першай мне кажуць: доктар, калі б я гэта ведаў 20 гадоў таму, я б ніколі так не зрабіў. Дзеянні другой групы цяжка растлумачыць. Гэта людзі, якія ўсё разумеюць, але ў іх пазіцыя страуса. Яны трымаюць галаву ў пяску: я нічога не бачу, значыць, усё добра, і гэта называецца самападманам. Я куру, але цыгарэта жаночая, або куру яе да палавіны. Ці пры праблеме з лішняй вагой: маўляў, гэта зусім не каларыйна, хоць чалавек і ўсведамляе, што тое няпраўда. Тут трэба працаваць з характарам, узмацняць сілу волі.

**«Шакалад і іншыя салодкія прысмакі там — добрыя крыніцы энергіі. Але ёсць і яшчэ адна ўласцівасць: прыгнятаць нашу імунную сістэму. Пакуль тая «есць» цукар, яна не супрацьстаіць вірусам і іншым інфекцыям».**

Для многіх з нас характэрныя рызыкоўныя паводзіны. Калі б не было рызыкі ў нашым жыцці, чалавецтва, магчыма, ужо і не існавала б. Першабытны чалавек выходзіў з пячоры паляваць, і гэта была рызыка, бо ён сам мог аказацца чыёйсьці здабычай. Многія вялікія адкрыцці былі зроблены, калі вучоныя рызыкавалі сваімі жыццямі. Але тут важна, наколькі апраўдана гэта рызыка. Першабытны чалавек павінен быў выходзіць з пячоры, бо інакш бы ён памёр з голаду. Калі чалавек забягае ў дом, які гарыць, і выратоўвае дзіця — рызыка апраўданая. На кожным пачку цыгарэт напісана, што цыгарэта забівае. І курэц свядома рызыкуе, думаючы: усіх забівае, але толькі не мяне. У нашай псіхалогіі ёсць такая праграма: усіх датычыцца, толькі не мяне. Штосьці дрэннае здарыцца, але з кімсьці іншым, а не са мной. Мы заўсёды сябе аддзяляем, бо так лягчэй рызыкаваць. Гэты ж механізм спрацоўвае ў хірурга-анколага, які аперыруе рак лёгкага, дасканальна ведае механізм яго ўтварэння, але сам курыць. Таму заўсёды трэба думаць, рабіць нешта ці не, вартая гэтая рызыка чагосьці або не.



Сэрца чалавека з нармальнай вагой.



Сэрца чалавека з лішняй вагой.



Сэрца вельмі поўнага чалавека.

Тут яшчэ праблема маркетынгу. Тыя, хто прадае алкаголь, цыгарэты, наркотыкі, бачаць найперш уласны прыбытак, а не наступствы. А патэнцыйным спажыўцам варта думаць пра сябе: дзеля чаго вы паддаяцеся рэкламе і спакусам?

***— Пра алкаголь, наркотыкі, цыгарэты ўсе ведаюць, што для арганізма гэта зло. З ежай іншая гісторыя. Як запускаецца механізм атлусцення і для якіх найперш органаў яно небяспечнае?***

— Траваедныя жывёлы, якія жывуць у мясцовасці, дзе трава па калена, не пакутуюць на атлусценне, бо ядуць яны роўна столькі, колькі ім трэба. Гэта датычыцца і іншых жывёл. Праблема атлусцення характэрная пераважна для чалавека. Яна ўзнікае, калі ў арганізм рэгулярна паступае больш калорый, чым расходуецца, і яны адкладваюцца. Тлушч нам патрэбны. Тлушчавая клятчатка — своеасаблівая ахова, цеплаізаляцыя нашага арганізма, запас энергіі на чорны дзень. У тлушчавым «дэпо» назапашваюцца і захоўваюцца нашы карысныя рэчывы.

Аднойчы кожная дзяўчынка заўважае, што сцёгны сталі большыя, і звычайна гэта не падабаецца. Але тут захоўваюцца пэўныя карысныя рэчывы, якія патрэбны для развіцця будучага дзіцяці, і назапашваюцца яны прыкладна да 22 гадоў. Таму для правільнага ўнутрывантробнага развіцця дзіцяці пажадана, каб узрост маці быў не менш за 22 гады. За дзевяць месяцаў цяжарнасці гэтыя рэчывы расходуюцца, і каб яны зноў назапасіліся, патрэбна два гады. Таму паміж цяжарнасцямі мусіць быць менавіта такі перапынак. З гэтай прычыны не ўсе тлушчы дрэнныя, а некаторыя і зусім неабходныя, падабаецца нам гэта ці не.

Але так здараецца, што мы назапашваем і лішні тлушч. Атлусценне небяспечна найперш для сардэчна-сасудзістай сістэмы. Таксама гэта дадатковая нагрузка на пазваночнік і суставы, што выклікае ранніх артрозы. Акрамя таго, атлусценне ў некаторых выпадках становіцца прычынай развіцця цукровага дыябету II тыпу. Што датычыцца сардэчна-сасудзістай сістэмы, калі мы ў краме набываем свіное сэрца, вакол яго можна заўважыць крыху тлушчу. Гэтак жа і ў чалавека — тлушч назапашваецца вакол сэрца — усё больш і больш. І сэрца вымушана працаваць праз гэты тлушч — што з'яўляецца дадатковай і немалой нагрузкай.

Ён назапашваецца і вакол сасудаў, змяншаючы іх эластычнасць. А мы атрымліваем гіпертанічныя хваробы, у прыватнасці, высокі ціск. Сасуды мусяць быць эластычныя, у адваротным выпадку ім цяжка расшырацца і звужацца. Пасля пэўнага моманту тэта змены незваротныя, і нават калі чалавек пахудзеў, ні сасуды, ні ціск не вернуцца ў норму. Гэтак жа як і ў курца сасуды робяцца неэластычныя, а пасля пэўнага стажу, нават калі той кідае курыць, яны не могуць вярнуць сваю ранейшую эластычнасць. Таму ачышчэнне сасудаў — гэта міф. Не існуе такіх прэпаратаў. Калі я аперырую і прысутнічаюць студэнты, асабліва курцы, я ім паказваю, што адбываецца з сасудам: стукаю скальпелем па бляшцы — і гэта гук металу па метале. Нават нажніцамі ў такім месцы складана рэзаць.

**«Заўсёды кажу сваім пацыентам, якія вырашылі пахудзець: снедай, абедай, але не вячэрай».**

Дзяўчына кажа: буду курыць, а падчас цяжарнасці кіну. Але цыгарэты выклікаюць незваротныя працэсы. Гэта неэластычныя сценкі сасудаў, і іх не вернеш у ранейшы стан. У дзяўчат гэта пашкоджаныя яйцаклеткі, якія не аднаўляюцца. Гэта сапсаваныя лёгкія, хоць яны з гадамі ачышчаюцца. Таму лепш да пункта незвароту не ісці.

***— Як змагацца з пераяданнем?***

— Як кажуць, усе задавальненні або незаконныя, або распусныя, або вядуць да атлусцення. Апошняе — гэта вынік лёгкага задавальнення, якое мы атрымліваем ад ежы. Каб атрымаць асалоду, скажам, ад мора, варта ўсё спланаваць, набыць пуцёўкі, паехаць. А тут узяў штосьці смачнае, разжоўваеш і атрымліваеш імгненны кайф. Гэта доўжыцца, пакуль ежа ў роце. Як толькі яна апускаецца ў страўнік, а там няма смакавых рэцэптараў, мы ўжо не адчуваем задавальнення. І патрэбна новая порцыя. І так, кавалачак за кавалачкам, незаўважна пераядаем. Задавальненне мы атрымліваем тут і цяпер і яно імгненнае, а расплачваецца нашаму арганізму за яго яшчэ працяглы час.

Ёсць розныя методыкі, каб адключыць гэта імгненнае задавальненне. Наклейце на халадзільнік выяву тоўстага непрыгожага чалавека. Ці, напрыклад, укруціце ў халадзільнік сінюю лямпачку. Катлета ці каўбаса пад сіняй лямпачкай выглядаюць не так апетытна. Таму ў крамах у халадзільніках з мяснымі вырабамі чырвоная лямпачка, у такім святле мяса выклікае апетыт. Можна ўстанавіць сабе абмежаванні па гадзінніку: не есці пасля шасці. Калі ўвечары адчуваеце голад, з'ешце колькі цвятной капусты, агуркоў, салаты. Ёсць прадукты з адмоўнымі калорыямі, на перапрацоўванне якіх арганізм траціць больш энергіі, чым атрымлівае ад іх. Дыетолагі прыдумалі шмат спосабаў.

Заўсёды кажу сваім пацыентам, якія вырашылі пахудзець: снедай, абедай, але не вячэрай. Не паспееў паснедаць — абедай, але не вячэрай. Паснедаў, не паспееў паабедаць — не вячэрай. Не паспееў паснедаць і паабедаць — усё роўна не вячэрай. Позняя вячэра шкодная, бо арганізм у гэты час рыхтуецца да сну. Сэрца працуе ў іншым рэжыме, нервовая сістэма пачынае назапашваць пэўныя рэчывы, увесь арганізм пачынае перазагружацца. І калі мы вячэраем перад сном, арганізм павінен пераправіць гэтую ежу. Чалавек спіць, а сэрца і страўнікава-кішачны тракт павінны працаваць, як удзень. У выніку раніцай вы адчуваеце стомленасць і разбітасць. Бо нават калі спалі восем гадзін, арганізм адпачываў усяго чатыры. Ён забраў з ежы пажыўныя рэчывы, калорыі, — і куды іх? Правільна, адкласці ў «дэпо». Таму ёсць такая справядлівая прымаўка: сняданак з'еш сам, абед падзялі з сябрам, вячэру аддай ворагу.

Відавочна, што ўсё забараніць нельга, трэба шукаць залатую сярэдзіну. Адзначыць Новы год, дзень нараджэння ўвечары ў рэстаране, зразумела, не забараняецца. Але такія нагоды бываюць не кожны дзень. Калі на Новы год пераелі, бо ўсё было смачнае і трэба было пакаштаваць, то можна зрабіць пасля разгрузачны дзень. Хочаш выпіць — выпі, але не перабаршчы. Калі ў чырвонага віна ёсць некаторыя плюсы, у невялікай колькасці яно спрыяе выпрацоўцы страўнікавага соку, выводзіць радыяцыю, то ў цыгарэт няма нічога. Як ні імкнуліся вытворцы цыгарэт, якія зарабляюць на іх мільярды, знайсці хоць адзін плюс — не знайшлі, адны мінусы. Таму трэба быць абачлівым і ведаць меру. Можна і смачна есці, дэгустуючы, але памятаць пра патрэбы свайго арганізма. І тады жыццё будзе цудоўнае.

***— Ёсць дзве рэчы, якія называюць «белай смерцю» — цукар і соль. Калі не ўяўляеш жыццё без салодкага, гэта дрэнна?***

— У цукру ёсць такая карысная ўласцівасць — гэта лёгказасваяльны вугляроў, ад якога арганізм хутка атрымлівае энергію. І гэта незаменная рэч, напрыклад, для альпіністаў: падчас пад'ёму ў горы арганізм хутка губляе энергію. Шакалад і іншыя салодкія прысмакі там — добрыя крыніцы энергіі. Але ёсць і яшчэ адна ўласцівасць: прыгнятаць нашу імунную сістэму. Пакуль тая «есць» цукар, яна не супрацьстаіць вірусам і іншым інфекцыям. Калі арганізм цалкам здаровы, дома няма інфіцыраваных, калі чалавек не пакутуе на цукровы дыябет і ў яго няма сваякоў з гэтай хваробай, невялікая колькасць цукру, магчыма, і не пашкодзіць. Аднак падчас пандэміі COVID-19 нашаму арганізму патрэбна добрая імунная сістэма, таму аслабляць яе салодкім непажадана. Калі хварэеце, катэгарычна адмаўляйцеся ад салодкага. Так хутчэй паправіцеся. Не трэба забываць, што кожны дзень у нашым арганізме ўтвараюцца тысячы клетак, сярод іх ёсць і атыпічныя, або ракавыя, якія і мусіць знішчаць імунная сістэма. Таму не трэба хранічна зніжаць імунітэт.

**«Калі я аперырую і прысутнічаюць студэнты, асабліва курцы, я ім паказваю, што адбываецца з сасудам: стукаю скальпелем па бляшцы — і гэта гук металу па метале».**

Наконт солі ёсць розныя меркаванні. Раней, напрыклад, лічылася, што злоўжыванне соллю павялічвае ціск у гіпертонікаў. Потым вучоныя высветлілі, што гэта не так адназначна. Але ўсё ж такі наш арганізм любіць залатую сярэдзіну. Той жа ёд карысны для нашага арганізма, але яшчэ большую шкоду наносіць яго лішак. Ці фтор: ён жыццёва неабходны, але яшчэ горш, калі яго зашмат. На маю думку, усё ж лішак солі нанясе меншую шкоду, чым лішак цукру. Раней цукар маглі дазволіць сабе толькі багатыя людзі і тады было менш цукровага дыябету, а сустракаўся ён у больш сталым узросце. Цукар — гэта дадатковая нагрузка на нашу падстраўнікавую залозу, паколькі арганізму трэба нейтралізаваць інсулін, які выпрацоўваецца. Без цукру можна пражыць, але калі-ніколі кавалачак торта можна сабе дазволіць.

# ЁН БЫЎ ПРАРОК,

**Пагаварыць пра Караткевіча і яго спадчыну мы запрасілі намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктара філалагічных навук, дацэнта Яўгена ГАРАДНІЦКАГА, намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай і выдавецкай дзейнасці Алеся СУШУ, загадчыка кафедры гісторыі замежнай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ Ганну БУТЫРЧЫК, пісьменніка, мастака, выдаўца Адама ГЛОБУСА, пісьменніка, дзяржаўнага дзеяча, намесніка старшыні Беларускага фонду культуры Анатоля БУТЭВІЧА, кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ Анатоля ВЕРАБ'Я, кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі БДУ Пятра ЖАЎНЯРОВІЧА.**


Яўген ГАРАДНІЦКІ.


Алесь СУША.


Ганна БУТЫРЧЫК.


Адам ГЛОБУС.

***— Сёння Уладзімір Караткевіч стаў сімвалам. Вам не здаецца, што ягоныя чалавечыя рысы ўсё больш размываюцца, нівеліруюцца? Які міф пра яго вы б забаранілі, а які, наадварот, стварылі б?***

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** Караткевіч як сімвал — гэта ўжо бясспрэчная ісціна. Як піша моладзь у інтэрнэце, «Караткевіч forever». «Размыванне» чалавечых рыс заўсёды адбываецца з цягам часу, бо ўсё менш застаецца тых, хто з ім сябраваў, хто яго ведаў, а то і проста бачыў. А некаторыя «жывыя сведкі» часам вылузваюцца са скуры, каб выкінуць у інтэрнэт-прастору нейкае сваё «бачанне» Караткевіча. І гэта сведчанне пачынае тыражавацца, уваходзіць у грамадскую свядомасць і засланяць праз сваю рэкламнасць сапраўднага Караткевіча. У глабалізаваным свеце пакінуць штосьці толькі для знаўцаў практычна немагчыма — усё роўна гэты «міф» дзесьці вылезе. Няхай Караткевіч застанецца ў гісторыі такі, які быў, — адданы сын сваёй маці і сваёй Радзімы.

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** Суседства імя вялікага пісьменніка з рознага кшталту байкамі і міфамі — рэч непазбежная. Аднак адзначу: толькі ў яго творах вы сустрэнеце яго сапраўднага. Творчасць Уладзіміра Караткевіча паказвае вельмі выразна, што супярэчнасці паміж індывідуальна-аўтарскім і калектыўна-інтэртэкстуальным не з'яўляюцца непераадольнымі. Галоўнай задачай маёй кнігі «Чалавек Рэнесансу, прадвеснік постмадэрнізму: мастацкі свет Уладзіміра Караткевіча», што выйшла нядаўна ў выдавецтве «Звязда», было якраз паказаць, як спалучаюцца ў творах выдатнага пісьменніка аўтарская прысутнасць і аўтарская самабытнасць з арганічнай далучанасцю да сусветнай культуры.

**Адам ГЛОБУС:** Некалі я збіраў глупствы, напісаныя і расказаныя пра Уладзіміра Караткевіча. Сярод іх былі апавяданні пра гермафрадытызм дзядзькі Валодзі, былі показкі пра ягоную глыбокую веру ў Бога і пра гарэнне лампадак у ягонай кватэры, былі версіі пра смерць ад вялікай колькасці вострых прадуктаў, накшталт аджыкі ды гарчыцы... Я пакінуў збіраць гэтыя глупствы, бо іх колькасць і шматаблічнасць расла і расла. Найбольш мяне бянтэжыла тое, што хлусілі людзі вядомыя, яны ілгалі, ведаючы пра лжывасць сваіх успамінаў. Ілгуны верылі, што ствараюць правільны і патрэбны вобраз Караткевіча. За ілгунамі пайшлі паўтаральнікі хлусні... Пра гэта вельмі разумна сказала мая маці: «У іх свой Караткевіч, а ў нас свой». Наш Караткевіч разумны, вясёлы і жывы. Такім ён быў, ёсць і будзе.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** І сам Караткевіч, і яго жыццё, і створанае ім часта апынаецца (не без нашага наўмыснага ўплыву) у палоне міфалагізацыі. Галоўнае, каб гэта не замінала бачыць і разумець напісанае. Караткевіч так умела дадае да гістарычнай праўды свой домысел, што ўсё гэта разам і стварае непаўторнасць ягонага таленту. Але праўда і тое, што чым больш каля творчай асобы міфаў, тым больш у яе прыхільнікаў і людзей зацікаўленых.

**Ганна БУТЫРЧЫК:** Сучасная міфатворчасць досыць спантанная, тут цяжка нешта забараняць. Ёсць рэдкія відэа- і аўдыёзапісы, успаміны сучаснікаў, разважанні літаратараў і, перадусім, творы Караткевіча, на падставе якіх кожны будзе ствараць свой уяўны партрэт класіка, які неабавязкова будзе адпавядаць рэчаіснасці.

**Анатоль ВЕРАБЕЙ:** Уладзімір Караткевіч быў, ёсць і будзе прадвеснікам Адраджэння, апосталам беларускасці, рыцарам чалавечнасці, сумлення і свабоды. Ён — пісьменнік пераважна рамантычнага тыпу мыслення. І гэтым значны як геній і класік. Хацеў бы, каб яго рамантызм не ўспрымалі павярхоўна, як штосьці наіўнае, несур'ёзнае, недасканалае. Ён вялікі, як Уільям Шэкспір, Адам Міцкевіч, Аляксандр Пушкін, Янка Купала.

**Алесь СУША:** Так, апісаная тэндэнцыя вельмі заўважная. Уладзімір Караткевіч стаў сімвалічнай постаццю. Гэта і добра, і дрэнна. Цудоўна, што пісьменнік пазнавальны. Але падобная «сімвалізацыя» ў нейкай ступені «забівае» саміх творцаў,ператварае іх у чысты дух без плоці. І тут важна не згубіць нешта матэрыяльнае і пабытавае, не пазбаўляе праўды жыцця, праз якую нараджаліся цудоўныя творы.

***— Менавіта Караткевіч — тая асоба, вакол якой можна ствараць літаратурныя легенды, кшталту «Нядобрай кватэры» з «Майстра і Маргарыты» Булгакава альбо дома Шэрлака Холмса на Бэйкер-стрыт... Якія незвычайныя праекты па захаванні памяці Уладзіміра Караткевіча і папулярызацыі яго творчасці вы б прапанавалі?***

**Адам ГЛОБУС:** У гонар Уладзіміра Караткевіча варта зладжваць у Ратамцы, што пад Мінскам, фэст «Дзікае паляванне караля Стаха», у якім прымуць удзел вершнікі і рыцарскія клубы з усёй Беларусі.

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** Думаю, што адмыслова ствараць якіясьці артэфакты не варта. А вось турыстычны маршрут па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Караткевіча, можна распрацаваць.

**Анатоль ВЕРАБЕЙ:** Трэба наведваць мясціны, дзе быў пісьменнік і якія ён дасканала адлюстраваў у сваіх творах, прапагандаваць іх. Гэта блізкае і дарагое яму беларускае Прыдняпроўе, родная яго Орша, дзе ёсць бацькоўская хата і два музеі. Дзедаўская хата ў Рагачове, дзе пісьменнік плённа працаваў — гэты горад быў для яго тым, чым былі для Гётэ Ваймар, для Пушкіна Болдзіна, для Льва Талстога Ясная Паляна, для Янкі Купалы Акопы. Варта наведаць каля Рагачова вёску Азярышча, каб убачыць тую мясціну, дзе на высокім стромкім беразе «груша цвіла апошні год» (пачатковыя радкі рамана «Каласы пад сярпом тваім»). Каб там жа ўбачыць Доўгую Кручу, дзе на строме вісяць сосны, страшна скурчаныя, каранямі ўгору і свежымі шатамі ўніз, якія пісьменнік згадаў у сваіх творах. Караткевічавы шляхі... Палессе, Полацк, Тураў, Кіеў, Масква, Крым, запаведнік Кедравая падзь у Хабараўскім краі, Польшча, Чэхія, Славакія... І, вядома, мясціны, звязаныя з пісьменнікам у Мінску: яго кватэры на вуліцах Чарнышэўскага, Веры Харужай (там адбываюцца мінскія падзеі рамана «Чорны замак Альшанскі»), Карла Маркса.

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** Папулярызаваць Караткевіча трэба праз пераклады на асноўныя мовы свету, тады значнасць зробленага ім будзе даследавацца ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай літаратуры. Некаторыя ж пісьменнікі, так бы мовіць, «усплывалі» праз стагоддзі.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** Я не стараюся б бегма бегчы за тымі, хто імкнецца ствараць літаратурныя легенды пра творчую асобу. Больш карысна проста выдаваць яго творы, чытаць іх, экранізаваць. А для яшчэ большай папулярызацыі творчасці гэтага майстра слова я б прапанаваў заснаваць літаратурную прэмію імя Уладзіміра Караткевіча для самых таленавітых пісьменнікаў гістарычнай тэматыкі, а мо, нават і для апантаных краязнаўцаў.

**Ганна БУТЫРЧЫК:** Я чамусьці думаю не пра кватэру ці дом, я думаю аб парку Уладзіміра Караткевіча са скульптурамі герояў на якой-небудзь літаратурнай сцежцы-квэсце па творах пісьменніка. Уяўляеце сабе Гервасія Выліваху, які гуляе ў шахматы са Смерцю? Альбо Алеся Загорскага на белым кані? Андрэя Беларэцкага і Надзею Яноўскую? Са шматлікімі цытатамі, раскіданымі ў самых нечаканых мясцінах парку: ад усім вядомых «Рабі нечаканае, рабі, як не робіць ніхто», «Кожны носіць сваё неба з сабой» да менш пазнавальных. Як літаратуразнавец, я хачу, каб пасля паспяховага ажыццяўлення акадэмічнага 25-томнага выдання твораў Караткевіча з'явіўся і яго энцыклапедычны даведнік з поўнай бібліяграфіяй па творчасці, аналізам твораў, паказальнікам герояў.

**Алесь СУША:** Магчымыя шматлікія «рымейкі», паколькі з майго вопыту многія творы Караткевіча чытаюцца і ўспрымаюцца рознымі людзьмі зусім па-рознаму. Адпаведна, яны могуць быць пададзены ў прынцыпова розных творчых формах. Асоба Уладзіміра Караткевіча і яго творчая спадчына маюць яшчэ багацейшы патэнцыял для творчага пераасэнсавання. Прывяду толькі адзін прыклад. Да юбілею пісьменніка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пачынае работу незвычайная выстаўка — «З кніг Уладзіміра Караткевіча». На ёй упершыню можна ўбачыць панараму кнігазбору пісьменніка з яго асабістага кабінета. Асноўнае месца ў экспазіцыі аддадзена экслібрысам Уладзіміра Караткевіча. Значная іх частка зроблена самім пісьменнікам. На выявах — Скарына, Гусоўскі, а таксама любімыя Караткевічам ветразі. Вылучаецца экслібрыс з абрысамі зброі касінераў. Унікальныя дароўныя надпісы на кнігах уводзяць у сяброўскае і творчае кола пісьменніка. Змена ракурсаў, іншае асвятленне: пісьменнік становіцца чытачом, але і бачна, як гэты чытач паступова стаў пісьменнікам, як пашыралася яго кола кантактаў і кола чытання. Мы вельмі ўдзячныя захавальнікам спадчыны Уладзіміра Караткевіча — сям'і пляменніцы пісьменніка Алены Іванаўны Сінькевіч.

***— Вядома, што Уладзімір Караткевіч быў гуманістам, меў шмат сяброў розных нацыянальнасцяў, спавядаў «нецярпімасць да нецярпімасці». З іншага боку, заяўляў: «Выбірай — быць пасрэднасцю на мове суседа або нечым значным на сваёй». Ці можна назваць яго чалавекам свету, або ўсё ж нацыяналістам?***

**Анатоль ВЕРАБЕЙ:** Самы любімы яго пісьменнік Максім Багдановіч — геніяльны ў беларускай і ў сусветнай літаратуры ў творах, якія напісаны на беларускай мове, рускамоўныя ж яго творы — сярэдняя руская белетрыстыка пачатку XX стагоддзя. Мне Мікола Грынчык, беларускі літаратуразнавец і сябар Уладзіміра Караткевіча, расказаў, што Караткевіч у пачатку 1950-х пасылаў свае творы ўкраінскаму паэту і акадэміку-літаратуразнаўцу Максіму Рыльскаму. Той параіў пачаткоўцу, што калі ён хоча рэалізавацца як пісьменнік, то няхай піша па-беларуску. Уладзімір Караткевіч і нацыяналіст, і чалавек свету.

**Адам ГЛОБУС:** Для мяне важна яшчэ і тое, што патрыятызм Караткевіча беларускамоўны. Дзякуючы гэтаму ён укаранёны ў Беларусь. Перакананы, што беларускі народ абраў Караткевіча ў свае героі не толькі за вялікі літаратурны талент, а і за ягоную паслядоўную беларускамоўнасць.

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** У Караткевічу паяднана шмат якасцяў, якія можна было б ахарактарызаваць як супрацьлеглыя або супярэчлівыя. Быў ён, напрыклад, апантаным працаголікам і разам з тым заўзятым падарожнікам. Зададзенае пытанне пра «чалавека свету» або «нацыяналіста» таксама намякае на магчымую супярэчлівасць. Адказ просты. Быў ён і тым, і тым. Цэльнасць чалавека не ў жалезабетоннай аднастайнасці, а ў натуральным аб'яднанні супрацьлегласцяў.

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** Караткевіч — полілінгвальная асоба, асабліва гэта датычыцца славянства. Ды і цалкам чалавекам свету Караткевіча назваць немагчыма: ён не раствараецца ў агульнай масе творцаў шматэтнічнага свету, ён адразу ўгадваецца як наш, свой, тутэйшы, беларус. Ніякага нацыяналізму ў яго няма — ёсць пачуццё абавязку, калі ўжо Бог дараваў талент, перад СВАІМ народам. Працаваць «не для сябе, а для роднай краіны, для Беларусі».

**Ганна БУТЫРЧЫК:** Я веру ў тое, што кожны чалавек свету найперш павінен быць нацыяналістам, таму што Сусвет адкрываецца ў спасціжэнні глыбіні самых простых рэчаў: адчування прыналежнасці да пэўнага роду, захаплення роднымі краявідамі і гучаннем народных песняў, смакавання роднай мовы. І Караткевіч тут не выключэнне. Заўжды апелюючы да нацыянальнага кантэксту, Караткевіч прапануе такія вобразы, сімвалы, сюжэты, што чытач даволі лёгка знаходзіць паралелі з сусветнай культурай. Нездарма адным з улюбёных заняткаў літаратуразнаўцаў з'яўляецца расчытванне біблейскага, міфалагічнага кантэксту твораў Караткевіча.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** Вядома ж, Караткевіч — чалавек свету. Але, безумоўна, са сваімі моцнымі нацыянальнымі каранямі. Бо без свайго, нацыянальнага, сур'ёзным творцам у свеце няма чаго рабіць. Караткевіч нястомна сцвярджае, што беларусы здаўна і на роўных у еўрапейскім хаўрусе, а праз гэта — і ў сусветным. Як і ён сам.

**Алесь СУША:** Караткевіч быў, як мне тое падаецца, і інтэрнацыяналістам, і нацыяналістам. Сапраўды, ён меў багата сяброў і знаёмых у самых розных краінах і з павагай ставіўся да іншых народаў і нацыянальнасцяў. Пры гэтым ён дайшоў да вельмі важнай ісціны, што каб цябе, твой народ і яго культуру паважалі, ты павінен паважаць іх сам. Калі ў цябе няма гонару за родны край, яго гісторыю і сучасныя дасягненні, калі ты адмаўляешся ад роднай мовы і забываеш традыцыі бацькоў, як можна спадзявацца, што іх будуць любіць і паважаць суседзі? Важна, што Караткевіч зрабіў гэта ў тым самым XX стагоддзі, калі беларусы бязмерна захапляліся «вялікімі і магутнымі» мовамі і культурамі суседніх народаў, а пры гэтым найбольш актыўна ў параўнанні з усімі ранейшымі часамі адмаўляліся ад уласнай культуры і матчынай мовы. Ён паказаў найперш самім беларусам, што нам ёсць чым ганарыцца, што мы, хай і не лепшыя (пра гэта ніхто не кажа), але і не горшыя, чым іншыя народы. У гэтым сэнсе Караткевіч, безумоўна, быў нацыяналістам. Урэшце, часам яго так і называлі — калі з папрокам, а калі з павагай.

***— Наколькі, на вашу думку, Караткевіч быў здольны на кампрамісы? Чым мог ахвяраваць дзеля творчасці?***

**Адам ГЛОБУС:** «Пагаджайся на рэдактарскія праўкі, а потым, калі будзеш перавыдаваць твор, вернеш свой арыгінальны варыянт...» —

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ЁН БЫЎ РАМАНТЫК


Анатоль БУТЭВІЧ.


Анатоль ВЕРАБЕЙ.


Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ.

так Уладзімір Караткевіч вучыў мяне верыць у сваю літаратурную зорку, якая паспрыяе перавыданню маіх тэкстаў. Вучыў, бо і сам верыў у сябе і сваю зорнасць і абранасць.

**Анатоль ВЕРАБЕЙ:** Пры падрыхтоўцы да друку рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі» ў пачатку 1960-х гадоў ён сказаў: «І коскі з месца не зрушу!» У кніжным выданні гэтага рамана (1982) ён вымушаны быў пакінуць назву, што была ў яго часопіснай публікацыі 1962 года, — «Нельга забыць». У зборы твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах (том 6), думаецца, захавана воля пісьменніка, бо гэты твор надрукаваны пад назвай «Леаніды не вернуцца да Зямлі». Пры падрыхтоўцы першага кніжнага выдання на беларускай мове рамана «Каласы пад сярпом тваім» (а згадзіўся дапамагчы ў гэтым пісьменніку Адам Мальдзіс). Уладзімір Караткевіч ахвяраваў нечым прыватным, каб твор быў выдадзены, але быў непахісны, калі адстойваў сутнаснае, істотнае.

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** Згадваецца адразу аповед Рыгора Барадуліна пра «і коску не зрушу!» Аднак, думаецца, Уладзімір Сымонавіч быў здольны ў нейкіх выпадках і на разумны кампраміс.

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** Караткевіч мог ісці на кампрамісы, але ў другарадным. Гэтага вымагала простае чалавечае існаванне на зямлі: ён прынцыпова не меў «партфеля», зарабляў толькі творчасцю, разумеў адказнасць за маці, забраў яе з Оршы. Таму і згаджаўся на змяненні ў сваіх творах (шмат якіх). Але калі, напрыклад, атрымаў шмат заўваг з «Нёмана» наконт эсэ «Святая Прадслава» пра Ефрасінню Полацкую, забраў твор з часопіса. Значыць, у 1960—1970-я гады ён мог ахвяраваць дзеля творчасці і матэрыяльным дабрабытам, і здароўем, і сямейнымі адносінамі.

**Алесь СУША:** Быў здольны на кампраміс. Ён быў чалавекам. І як асоба, і як творца ён вагаўся, аналізаваў розныя погляды, версіі, дакументы. І рабіў высновы, рабіў выбар. Часам, відаць, няпросты. Урэшце, усе (асабліва — творчыя) людзі штодня, калі не штохвіліну, робяць выбар.

**Ганна БУТЫРЧЫК:** У рэчышчы гэтага пытання чамусьці згадваюцца два «бескампрамісныя» выступленні Караткевіча. Першае — пры абмеркаванні «Каласоў...» у 1967-м, калі пісьменнік катэгарычна адмовіўся ісці супраць праўды і ператвараць «нацыянальнае», як ён лічыў, паўстанне Кастуся Каліноўскага 1863 года ў сацыяльнае, як настойвалі рэцэнзенты. Бескампрамісная пазіцыя пісьменніка не толькі аддаляла перспектыву выдання рамана, але і ставіла пад сумненне такую магчымасць увогуле. І другі, больш вядомы эпізод з пісьменніцкага пленума 1979 года, прысвечанага сучаснаму раману, са знакамітым тэзісам пра тое, што праблема сучаснага рамана — пісаць харошыя раманы і не гадзіць суседу. Па сутнасці, Караткевіч у адной фразе сфармуляваў сваё пісьменніцкае і жыццёвае крэда. Ён быў абсалютна нецярпімы да любых ацэнак мастацкай творчасці з пазіцыі, як ён гэта фармуляваў, «ідэалагічнай урэднасці» і абсалютна не выносіў фальшу ні ў творчасці, ні ў адносінах з людзьмі.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** Мне падаецца, што кожны сапраўдны пісьменнік дзеля творчасці ахвяруе ўсім сваім жыццём. Дык ці патрэбны яшчэ нейкія іншыя кампрамісы?

***— Як вы ставіцеся да выдання твораў пісьменніка з адноўленымі купюрамі, без рэдактарскіх правак? Ці заўсёды гэта на карысць твору?***

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** Выданні, у якіх асноўны тэкст дапаўняецца купюрамі, сёння даволі распаўсюджаны. Мэта ў іх перш за ўсё акцэнтаваць увагу на метамарфозах, што адбываліся з творам. У Зборы твораў варта было б прытрымлівацца традыцыйнай схемы: падаць спачатку асноўны тэкст, а пасля — у дадатку — варыянты, разначытанні, адноўленыя купюры. Інакш тэкст некаторых твораў Караткевіча («Леаніды не вернуцца да Зямлі», «Каласы пад сярпом тваім») успрымаецца неяк страката. І так, сапраўды, не ўсе вернутыя (кім у кожным канкрэтным выпадку?) купюры ўспрымаюцца як паляпшэнне твора.

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** Расійскі пісьменнік Міхаіл Велер пісаў, што рэдагаванне савецкага часу — «біч рускай літаратуры». Не выключэнне тут і беларуская літаратура. А адносна Караткевіча гэта выявілася найбольш выразна. Так, у новым Зборы твораў у рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі» адноўлены фрагменты пры ўзаемадачыненні Андрэя Грынкевіча з падрадчыкам, якія, з літаратуразнаўчага пункту гледжання, нібы парушаюць агульную стылістыку твора, але, безумоўна, дапамагаюць зразумець чытачу пякельную працу персанажа, каб зарабіць адпаведную суму грошай. Або ў эсэ «Казкі Янтарнай краіны» вяртаецца пачатак твора, у якім тлумачыцца аўтарскае сэнсавае напаўненне слоў «янтар» і «бурштын». Якраз вельмі важны аспект ва ўсёй структуры эсэ! Зразумела, што вернутыя фрагменты павінны былі прайсці рэдактарскую апрацоўку, але ў асноўным моўна-стылістычную праўку. Тут узнікае праблема ў тым, што аўтар, калі б ён раптам з'явіўся ў нашу сучасную зямную юдоль, убачыў бы творы, адрозныя ад рукапісаў і машынапісаў. Якія ён нібыта і не пісаў. Але такое ўласціва ўсім сусветным літаратурам... І Віктор Гюго, і Леў Талстой, і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч убачылі б тое ж... Мяркую, што падобнае вяртанне патрабуецца многім творам беларускай літаратуры. Дзеля прыкладу: у кнізе Уладзіміра Калесніка «Ветразі Адысея» пра Уладзіміра Жылку выкінуты фрагмент пра Алеся Гаруна, — паводле архіўных матэрыялаў Галоўліта, «националиста и врага белорусского народа периода гражданской войны». Таму вяртанне ў творы Караткевіча ліквідаваных фрагментаў — прыклад захавання аўтарскай волі.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** Кожнага з нас чытае і карэктуе рэдактар. Але калі праўкі і змяненні зроблены насуперак волі аўтара, то гэта несправядліва, варта вярнуцца да таго, што было напісана першапачаткова. Калі ж праўкі аказаліся прынятыя аўтарам, ён з імі пагадзіўся (такое таксама бывае даволі часта), то не варта настойваць.

**Ганна БУТЫРЧЫК:** Аўтарская рэдактура, па-мойму, шмат дадае да творчага партрэта Уладзіміра Караткевіча, які пільна вывяраў кожнае слова. Калі адкрываеш «дакупюрны» варыянт рамана «Каласы пад сярпом тваім», разумееш, што Караткевіч напісаў зусім іншы раман, чым мы прызвычаіліся чытаць. У «рэдактуры» вынішчаны нацыятворчы пафас рамана, выкраслены разважанні наконт беларускай дзяржаўнасці, так званай Рэспубліцы Вялікай Ракі; практычна спляжаны хрысціянскі кантэкст, зададзены эпіграфамі з Евангелляў паводле Лукі і Мацвея. Выразаныя моманты, што задавалі паралелі вобраза Алеся Загорскага, які хоча «выкупіць грахі ўсіх, сваёй крывёю здабыць вызваленне для ўсіх, загінуць за ўсіх», з вобразам Хрыста. Прывяду толькі адзін прыклад замены двух радкоў у апошнім вершы Алеся Загорскага («Чым угнявіла ты Бога...»). Згадзіцеся, што радкі «З мовай памерла. Для заўтрашніх дзён не ўваскрэсла, / Каб на руінах маіх выкуплення зярняты ўзраслі» ў пачатковым варыянце ў параўнанні з радкамі «У бітвах скрываўлена, каб чалавецтва ўваскрэсла, / Каб на палетках ягоных воля і мова ўзраслі» ў савецкіх выданнях задаюць абсалютна іншыя параметры інтэрпрэтацыі твора. Таму я настойліва рэкамендую ўсім аматарам творчасці Караткевіча пагля дзець адноўлены варыянт рамана.

**Адам ГЛОБУС:** Добра, калі ў такіх выданнях карэктура зроблена на выдатна.

**Алесь СУША:** Стаўлюся ў цэлым станоўча, але і асцярожна. Для даследчыкаў бывае важна дазнацца, як сам аўтар працаваў з тэкстам, што змянілі рэдактары і выдаўцы. Гэта дазваляе рэканструяваць ход думкі пісьменніка і лепш зразумець яго пачатковыя ідэі. З іншага боку, выданне «сырога» тэксту часам паказвае яго пачатковую стылістычную ці граматычную недасканаласць. Урэшце, менавіта на гэта ў асноўным скіраваны намаганні рэдактараў — каб палепшыць тэкст. Натуральна ж, большасць рэдактарскіх правак узгаднялася з аўтарам і канчатковая версія была вынікам іх супольнай працы. Таму вяртанне да пачатковай версіі не заўжды можа быць найлепшым шляхам для шырокай аўдыторыі.

***— Які ваш прагноз наконт выяўлення новых звестак, новых дакументаў ці рукапісаў Караткевіча? Ці знойдзецца працяг «Каласоў пад сярпом тваім»?***

**Адам ГЛОБУС:** На маіх вачах Караткевіч парадкаваў і перадаваў свае рукапісы ў архіў. Некалькі разоў ён расказваў мне пра тое, чаму не змог напісаць працяг «Каласоў пад сярпом тваім». Караткевіч не хацеў забіваць Кастуся Каліноўскага, не хацеў пісаць сцэны з катаваннямі і павешаннем найвядомейшага з нацыянальных герояў, таму ніякіх іншых раманаў Караткевіча ніхто не знойдзе. Зрэшты, літаратурная спадчына Караткевіча вялікая і без гіпатэтычных знаходак і дадаткаў. Давайце прачытаем і перачытаем яе.

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** Чаму ж не. Шукаць трэба заўсёды. Наконт знаходкі працягу «Каласоў пад сярпом тваім» не ўпэўнены. Перакананы толькі ў тым, што разам са знаходкай разбурыцца сапраўды прыгожая легенда.

**Анатоль ВЕРАБЕЙ:** Калі нешта знойдзецца, будзе вельмі добра. Вядомыя мне архіўныя матэрыялы не дазваляюць сцвярджаць, што раман быў закончаны. Думаю, што ў сярэдзіне 1960-х гадоў цяжкасці з выданнем, іншая работа, прычыны творчага плана не дазволілі закончыць «Каласы». У апошнія гады жыцця Уладзімір Караткевіч думаў завяршыць раман. Аднак смерць жонкі ў лютым 1983 года, якая моцна паўплывала на душэўны стан пісьменніка, уласная хвароба і ўрэшце смерць не дазволілі, на вялікі жаль, здзейсніць гэту задуму.

**Ганна БУТЫРЧЫК:** Хачу памыліцца, але я не веру ў тое, што чытач калі-небудзь убачыць працяг «Каласоў...», надта цяжка далася Караткевічу бітва за першыя кнігі. Думаю, што ўсведамленне таго, што працяг у тым выглядзе, якім ён быў задуманы, выдаць будзе немагчыма, прымусіў Караткевіча спыніць работу.

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** Новыя звесткі і дакументы, безумоўна, будуць з'яўляцца. Невядомы лёс рукапісу рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні: Евангелле ад Іуды». Праз адсутнасць у БДАМЛіМ матэрыялаў нашых літаратурных часопісаў за асобныя гады няма звестак пра рукапісы некаторых публіцыстычных твораў. Можна шукаць (і ўжо выяўлены) цікавыя дароўныя надпісы Караткевіча на кнігах, паштоўках і фотаздымках. Магчыма, існуюць нерассакрэчаныя дакументы і ў адпаведных органах. Наконт працягу (заканчэння) рамана «Каласы пад сярпом тваім»: маё меркаванне, заснаванае на вывучэнні творчай работы аўтара ў другой палове 1960-х — 1970-х гадах, зводзіцца да наступнага: можна, безумоўна, шукаць, але наўрад ці гэта перспектыўны занятак.

**Анатоль БУТЭВІЧ:** Хацелася б верыць, што нешта яшчэ можна знайсці. І калі б адшукаўся раптам працяг «Каласоў...», гэта было б найвялікшым шчасцем для ўсіх нас. А яшчэ я пастараўся б больш грунтоўна сабраць лісты аўтара, яго аўтографы, адным словам, усё-ўсё напісанае ім.

**Алесь СУША:** Прагноз станоўчы. Новыя дакументы ўвесь час знаходзяцца. Кола кантактаў Уладзіміра Сямёнавіча было вельмі шырокае. Але я хацеў бы, каб пошукі (а нават і працягу «Каласоў») і знаходкі працягваліся бясконца.

***— Калі падсумаваць: у чым прыцягальнасць і значнасць постаці Уладзіміра Караткевіча?***

**Адам ГЛОБУС:** Да Караткевіча жанры гістарычнага рамана і дэтэктыва лічыліся другаснымі і нават малапатрэбнымі ў беларускай літаратуры. Гістарычны раман «Каласы пад сярпом тваім» і прыгодніцка-дэтэктыўная аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» вывелі гэтыя жанры ў шэрагі ўзорных.

**Анатоль ВЕРАБЕЙ:** Ён шмат зрабіў для росту нацыянальнай свядомасці беларусаў, адраджэння іх гістарычнай памяці. Ён узвысіў беларусаў, паказаў іх трагічную і велічную гісторыю. Асуджаў тыранію, дэспатызм і здраду Радзіме. Яго творчасць, пры ўсім драматызме і нават трагізме, жыццярадасная і аптымістычная. Уладзімір Караткевіч — сумленне беларускага народа.

**Пётр ЖАЎНЯРОВІЧ:** На жаль, у савецкі час ён не мог напісаць усё, што думаў, — шмат што адышло разам з ім. Такіх людзей пасылае Неба кожнаму народу нячаста. Прыцягальнасць постаці Караткевіча — у яго сучаснасці, бо амаль усе творы не пакрыліся пацінай часу, чытаюцца з захапленнем. Ён сярод нас, ён нібы пазірае і ацэньвае нашы ўчынкі і паводзіны. Караткевіч у другой палове XX стагоддзя далучыў беларускую літаратуру да еўрапейскасці, а сваімі творамі разбураў састарэлыя палажэнні гісторыкаў-сацыялагізатараў — аўтараў падручнікаў і дапаможнікаў, — і такім чынам наблізіў незалежнасць Беларусі. Яго няма сярод нас, але засталіся словы з верша пра Паўлюка Багрыма: «Памятаю і веру: / Калісьці над светлымі водамі, / Над свабоднай зямлёю / І над Белаю Руссю маёй / Шчасце сонцам зазяе / І слова нашчадка свабоднага / Мае раны загоіць / Гаючай жывою вадой».

**Ганна БУТЫРЧЫК:** Адна з асноўных заслуг Уладзіміра Караткевіча палягае ў разбурэнні стэрэатыпу ўспрыняцця беларускай нацыі выключна як сялянскай, у пашырэнні ўяўлення пра беларусаў як пра шляхецкую нацыю, у стварэнні нацыятворчых раманаў і аповесцяў (найперш «Дзікае паляванне караля Стаха», «Ладдзя Роспачы» і, вядома, «Каласы пад сярпом тваім»). Паэтызуючы і, адпаведна, пэўным чынам міфалагізуючы такіх гістарычных асоб, як Кастусь Каліноўскі, Уладзіслаў Сыракомля, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч, Станіслаў Манюшка і іншыя, па сутнасці, Караткевіч распачынае неабходную для любой нацыі традыцыю замацавання ў нацыянальнай літаратуры найбольш значных постацяў айчыннай гісторыі. Не менш важнай для нацыятворчасці з'яўляецца стварэнне цэлай плеяды герояў, здольных перамагчы Дзікае паляванне і саму Смерць, вярнуцца з пекла, запаліць светач жыцця. І як сказаў у вершы «Валодзя Караткевіч на беразе Дняпра» Антон Рудак: «Ён прыйшоў і адзін нарадзіў Беларусь / І для першага разу някепска ўдалося».

**Анатоль БУТЭВІЧ:** Ён, як ніхто да яго, здолеў так гістарызаваць сучаснасць і так асучасніць гісторыю, што ў кожнага нараджаецца пачуццё далучанасці да далёкіх спраў продкаў. Мэтанакіравана дабіваўся стварэння нацыянальнага міфа. Паэтызаваў гісторыю, каб прывабіць чытача.

**Алесь СУША:** Караткевіч перастварыў сучасную беларускую літаратуру, вывеў яе на якасна новы ўзровень, як гэта зрабіў у канцы XIX стагоддзя Францішак Багушэвіч, а ў пачатку XX стагоддзя — Максім Багдановіч. Караткевіч дазволіў беларусам ганарыцца беларускай літаратурай. І вяртання назад пасля падобных апорных пунктаў ужо быць не можа. Далей — толькі наперад.

**Яўген ГАРАДНІЦКІ:** Ці варта падсумоўваць? Караткевіч прадаўжаецца!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## О реализации имущества ЗАО «Ростэм»

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by** |
| Продавец | **ЗАО «Ростэм» в лице антикризисного управляющего ООО «Центр финансового оздоровления «Партнер-Консультант» (220113, Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-11, тел. 8 (029) 365-06-97)** |
| Дата, время, место и форма проведения торгов | **Торги в форме открытого аукциона состоятся 31.12.2020 в 12.00** (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121 |
| Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним | **Лот № 1.** Предприятие как имущественный комплекс «Центральный рынок строительных материалов в Уручье» (рег. номер 0001440, свидетельство № 3616 от 25.08.2020); (местонахождение предмета торгов – г. Минск, ул. Уручская 19).<br>В отношении вышеуказанного имущества торги проводятся впервые.<br>Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. **Контактное лицо для осмотра Объектов: +375 (29) 611-18-59, Лембович Татьяна Казимировна.**<br>**Дополнительная информация по предмету торгов по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида)** |
| Начальная цена предмета торгов | **8 623 000,00 бел. руб. без НДС** |
| Порядок определения победителя | **Шаг торгов – 431 150,00** бел. руб. (**5 %** от начальной цены предмета аукциона). Победителем аукциона признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других участников. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявка на участие в них подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 % |
| Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка | **Сумма задатка для участия в торгах – 10 %** от начальной цены предмета аукциона. Задаток – **862 300,00** бел. руб.<br>Для участия в торгах необходимо перечислить сумму задатка на р/с **BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Ростэм» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.»<br>**Срок внесения задатка: с 10.00 01.12.2020 г. по 16.00 30.12.2020 г.** |
| Порядок приема заявок на участие в торгах | Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121, тел. +375 29 305 86 50.<br>**Начало приема заявлений в 10.00 01.12.2020 г.**<br>**Окончание приема заявлений в 16.00 30.12.2020 г.** |
| Возмещение затрат | Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.<br>**Вознаграждение аукциониста – 0,75 % от начальной цены предмета торгов.**<br>**Государственная регистрация договора купли-продажи и объектов недвижимости осуществляется Покупателем за свой счет.**<br>На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона |
| Срок подписания договора купли-продажи предмета торгов | Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона |
| Срок оплаты предмета торгов | Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона |
| Иная информация | **Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/.**<br>Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.<br>Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Оршанский станкостроительный завод «Красный борец», 211391, Витебская обл., г. Орша, ул. Фридриха Энгельса, 29, тел. 8 0216 518122.

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 240/D-41960 площадью 34,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-я Красная, 7-30, наименование – квартира 30, назначение – квартира. Однокомнатная благоустроенная квартира с кухней, коридором, совмещенным санузлом, кладовой, лоджией. Жилая площадь – 17,1 кв. м. Этаж – № 2.

**Нач. цена** – 37000,00 бел. руб. без учета НДС.

**Задаток:** 3700 бел. руб.

**Дата, время и место проведения торгов**: **28.12.2020 в 11.00** по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Фридриха Энгельса, 29, в здании ОАО «Станкозавод «Красный борец». Срок внесения задатков и приема документов: **с 25.11.2020 с 08.30 по 24.12.2020 до 16.30.** Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566**. **Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение лота по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:** в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; заключить договор купли-продажи в течение 12 рабочих дней с даты проведения аукциона; оплата расходов по государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности жилого изолированного помещения осуществляется за счет Покупателя; оплата по договору осуществляется в порядке и сроки, установленные договором-купли продажи; оплата НДС сверх цены продажи имущества.

**Аукцион проводится в порядке**, установленном Положением о порядке продажи жилых помещений государственного жилищного фонда на аукционе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 17.11.2010 № 1695. Участниками аукциона могут быть граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, юридические лица, в том числе иностранные и международные, если иное не установлено законодательными актами или международными договорами Республики Беларусь. Лицо, желающее принять участие в аукционе, лично либо через своего представителя в установленный в извещении срок подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе, заверенную банком копию платежного поручения о перечислении задатка на р/с организатора аукциона, а также заключает с организатором аукциона соглашение. К заявлению на участие в аукционе прилагаются: копии учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации юр. лица, их подлинники для последующего заверения копий организатором аукциона – для юр. лица, зарегистрированного в установленном порядке на территории РБ; легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (должна быть произведена не ранее чем за шесть месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский или русский язык – для юр. лица, не зарегистрированного в установленном порядке на территории РБ. При подаче заявления на участие в аукционе и заключении соглашения предъявляются: физ. лицом – документ, удостоверяющий личность; представителем физ. лица – документ, удостоверяющий личность, и нотариально заверенная доверенность; представителем юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (44) 582-81-12, Батура Любовь Евгеньевна.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| Продавец | **Копыльское районное потребительское общество, г. Копыль, пл. Ленина, 21** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1** | |
| Столовая (назначение: здание специализир. для обществен. питания, об. пл. 532,3 кв. м, инвен. № 642/С-27091, составные части: три пристройки, теневой навес).<br>Местоположение: **Минская обл., Копыльский р-н, Копыльский с/с, д. Дусаевщина, ул. Приозерная, 11** | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0825 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 24.07.2031) для размещения объектов обществен. питания (обслуживания здания столовой). Ограничения (обременения): водоохранная зона (р. Выня), ограничение прав в использовании земель по строительству, благоустройству и тому подобное (линия электропередачи напряжением до 1000 Вт, пл. 0,0136 га) | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 10 500,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2** | |
| Магазин (назначение: здание специализир. рознич. торговли, об. пл. 146 кв. м, инвен. № 642/С-11171, составные части: пристройка).<br>Местоположение: **Минская обл., Копыльский р-н, Тимковичский с/с, д. Степуры, ул. Несвижская, 24А** | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0810 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 15.09.2030) для строительства и обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения): охранные зоны электрич. сетей напряжением до 1000 Вт, пл. 0,0119 га | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 500,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 21.10.2020 | |
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | **Начало торгов: 08.12.2020 в 12.00.**<br>**Окончание торгов: 08.12.2020 в 13.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| Дата и время окончания приема заявок | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.12.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 17.12.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 633/С-11846 общей площадью 236,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Занарочский с/с, 6. Назначение: здание специализированное для рыбоводства; наименование: здание инкубационного цеха по воспроизводству малька аборигенных видов рыб. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624081403601000321 площадью 38,5927 га. **Начальная цена продажи – 37 908,00 бел. рубля, задаток – 3 790,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Машино-место № 149 с инвентарным номером 500/D-708120469 общей площадью 20,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-364. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 14 580,00 бел. рубля, задаток – 1 458,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Машино-место № 143 с инвентарным номером 500/D-708120462 общей площадью 18,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-356. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 13 996,80 бел. рубля, задаток – 1 399,68 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Машино-место № 143.1 с инвентарным номером 500/D-708120461 общей площадью 18,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-355. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 13 996,80 бел. рубля, задаток – 1 399,68 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5**. Машино-место № 142 с инвентарным номером 500/D-708120460 общей площадью 21,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-354. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 14 774,40 бел. рубля, задаток – 1 477,44 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Машино-место № 144 с инвентарным номером 500/D-708120463 общей площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-357. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 16 038,00 бел. рубля, задаток – 1 603,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Машино-место № 147 с инвентарным номером 500/D-708120465 общей площадью 12,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-360. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 16 038,00 бел. рубля, задаток – 1 603,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Машино-место № 149.1 с инвентарным номером 500/D-708120468 общей площадью 20,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-363. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 14 580,00 бел. рубля, задаток – 1 458,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Машино-место № 141 с инвентарным номером 500/D-708120458 общей площадью 14,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-352. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 16 524,00 бел. рубля, задаток – 1 652,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Земельный участок с кадастровым номером 323582003601000001 площадью 0,1000 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, Махновичский с/с, д. Зеленый Мох, ул. Луговая, 8, с расположенными на нем строительными материалами, вложенными в строительство деревянного дома. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. **Начальная цена продажи – 999,20 бел. рубля, задаток – 99,92 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-79467 общей площадью 8,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2/5. Назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование: автозаправочный пункт. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030 площадью 4,4298 га. **Начальная цена продажи – 252 547,20 бел. рубля, задаток – 25 254,72 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-4466 общей площадью 76,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Красноармейская, д. 85. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000022000029 площадью 0,7055 га. **Начальная цена продажи – 8 991,00 бел. рубля, задаток – 899,10 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 613/С-14439 общей площадью 360,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Московская, 7. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта; наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623050100001002654 площадью 0,1156 га. **Начальная цена продажи – 25 952,40 бел. рубля, задаток – 2 595,24 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-26688 общей площадью 597,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, 142/3. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 221550100001003890 площадью 0,0484 га. **Начальная цена продажи – 90 648,00 бел. рубля, задаток – 9 064,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-61160 общей площадью 3 568,7 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административно-бытовой корпус № 3. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466 площадью 10,4867 га. **Начальная цена продажи – 2 793 312,00 бел. рубля, задаток – 279 331,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Объект недвижимости в составе незавершенного незаконсервированного капитального строения, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624883000601000106 общей площадью 0,2499 га по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Багута. **Начальная цена продажи – 113 184,00 бел. рубля, задаток – 11 318,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 17.** Капитальное строение с инвентарным номером 123/С-891, общей площадью 944,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Кобринский р-н, г. Кобрин, ул. Первомайская, 149. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: здание цеха лесопиления. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 124350100001000593 площадью 1,1577 га. **Начальная цена продажи – 100 023,12 бел. рубля, задаток – 10 002,31 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 18.** Недвижимое имущество: баржа-площадка для перевозки навалочных и тарно-штучных грузов «Р-0562»; регистровый номер Б-6684; год постройки – 1989; проект № 775; порт приписки – филиал РТУП «Белорусское речное пароходство» Речной порт Гомель. **Начальная цена продажи – 224 640,00 бел. рубля, размер задатка – 22 464,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**ВНИМАНИЕ!** Произошли изменения в начальной стоимости лота № 5 в извещении об аукционе, назначенном на 24.12.2020:

**Лот № 5**. Капитальное строение с инвентарным номером 431/С-517 общей площадью 55,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, Малюшичский с/с, д. Скорово, 11. Назначение: здание одноквартирного жилого дома; наименование: одноэтажный деревянный жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 423382509601000001 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 801,00 бел. рубля, задаток – 80,10 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 17.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 14.12.2020 в 15.00.**

Задаток перечисляется на р/с BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBNBY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **17 декабря 2020 года.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63**

Падпіска-2020

# «ЗВЯЗДА» — ГАЗЕТА ДАРАГАЯ

## Як дарагое ўсё, што ты любіш

**Добрую думку і паўтарыць не грэх.**
**Такім чынам, самае галоўнае дасягненне «Звязды» — гэта яе падпісчыкі. Не з усімі — вядома ж і на жаль — мы знаёмыя, што называецца, асабіста, аднак з асобнымі — нават сябруем і досыць даўно. Тут і цяпер — хіба адна такая гісторыя адной асобы.**

Ёй, спадарыні Кусянковай, жыхарцы старажытнай вёскі Лучын, якая раней размаўляла па-беларуску, вельмі крыўдна было, што людзі вяскоўцы, яе землякі пераходзяць на іншую — зракаюцца гэтай мовы. Каб неяк падтрымаць яе (для пачатку — хоць бы ў сабе), Соф'я Парфір'еўна выпісала беларускую газету.

Спачатку, як прызнавалася, проста чытала (праўда, шмат што — з задавальненнем), потым, убачыўшы ў адным выданні здымкі «веліканаў» (нехта хваліўся сваімі памідорамі, хтосьці — гарбузамі...), узяла ды сфатаграфавала (а яна гэта ўмее — як і многае іншае) свае кавуны (яны ў той год на дзіва ўрадзілі!) і даслала фота ў рэдакцыю.

Кадр, што прыемна, «Звязда» надрукавала. Разам з аповедам пра вопыт па вырошчванні.

Што было далей?

Публікацыя мела поспех: на адрас аўтара прыйшлі першыя водгукі — з пытаннямі, з просьбай падзяліцца насеннем... Знаная лучынская агародніца нікому не адмовіла і такім чынам займела новых добрых знаёмцаў, а то і сяброў.

Кола іх пашырэла і пагатоў, калі на старонках газеты сталі з'яўляцца (ну чаму б і не?!) «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» за подпісам «Соф'я Кусянкова, вёска Лучын...» У першай з іх маладзіца расказвала, як ехала з Рагачова ў новым, пашытым на заказ штроксавым пінжачку, як лавіла на сабе, ну вядома ж, зайздросныя позіркі жанчын і цікаўныя — мужчын, як чакала, што нейкі з іх вось зараз падыдзе і загаворыць (мо з усімі адсюль на-



ступствамі)... А падышла жанчына, сказала, што ў яе на плячах нейкая паперка... Як аказалася — квітанцыя — з нумарам заказу і прозвішчам...

Такіх вось кароткіх ці трохі даўжэйшых гісторый — са свайго жыцця, з жыцця землякоў — за гады сабралася добрая сотня. А да ўсяго, дзякуючы «Звяздзе», з'явілася патрэба запісаць гісторыю сваёй вёскі, сабраць мясцовыя тапонімы і мянушкі людзей, стварыць адмысловы лучынскі слоўнік з усімі яго залацінкамі...

Што прыемна, гэта работа была заўважана (у тым ліку Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Акадэміі навук). Нават больш за тое — усё сабранае ў рамках аднаго з праектаў Еўрапейскага саюза і пры садзейнічанні аддзела ідэалагічнай работы мясцовага райвыканкама выйшла асобнай прыгожай кніжкай, аўтарка якой у той год была ўдастоена штогадовай раённай прэміі «Залаты рог».

...Здабыткі можна пералічваць далей, бо з цягам часу, «начытаўшыся любімай газеты», Соф'я Парфір'еўна стала нешта рыфмаваць і ўдзельнічаць у конкурсе на найлепшы подпіс да фота, складаць вершаваныя байкі і прыпеўкі (на гармоніку яна іграе здаўна), з вялікім поспехам выступаць (хоць яна таго і не любіць) у мясцовым клубе, узначальваць у «Звяздзе» вялікае чытацкае журы ў конкурсе на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю, трымаць сувязь з іншымі сябрамі газеты.

Адно, у чым спадарыні Кусянковай ніколі не шчасціла — гэта звяздоўская латарэя. Не выйграўшы ў ёй ні трубкі шпалераў, ні парачкі парсючкоў (былі такія прызы ў мінулым стагоддзі), чытачка махнула рукой і сваіх картак на розыгрыш больш не пасылала — ну хіба гады ў рады... Раз на пяцігодку...

А таму і спісы шчасліўчыкаў глядзела хіба краем вока: мо, там нехта знаёмы? І раптам...

Не, цуды ўсё-ткі здараюцца!

Хоць-нехаць паверыўшы ў іх, Соф'я Парфір'еўна ўжо думала, як бы забраць той выйграны прыз: ехаць самой і далекавата і цяжкавата, кагосьці абцяжарваць таксама не хочацца... А сушылка ж — рэч у гаспадарцы патрэбная: грыбы, шкада, адышлі, але яблыкі пасушыць яшчэ можна...

Зрабіць гэта цяпер нішто не замінае, бо прыз звяздоўцы прывезлі і перадалі, што называецца, з рук у рукі. Хай служыць на дабро і здароўе, хай радуе!

**Валянціна ДОЎНАР.**

**P.S.** *Спадарыні Кусянковай (як, дарэчы, і іншым нашым падпісчыкам) не раз гаварылі, што «Звязда», маўляў, газета дарагая... Ёсць таннейшыя...*

*Яе адказ — у загалоўку, да якога застаецца, хіба, дадаць колькі слоў з яе ж прадмовы да кнігі «Сто гісторый пра Лучын»: «Па маім глыбокім перакананні, гаварыць пра любоў да Радзімы, спяваць пра яе трэба толькі на роднай мове. Інакш — і няправільна, і няшчыра, і непрыгожа, і непаважліва — і да Радзімы, і да сябе».*

Чалавек — чалавеку

# «ВАМ ПАДАРУНАК, АЛЕ ЗА ГРОШЫ»

**Пра тое, што трэба асцерагацца данайцаў, якія прыносяць дары, вядома здаўна і многім. Але па сённяшнім часе варта асцерагацца не толькі іх, але і асобных гандляроў.**
**Спытаеце, якая тут сувязь з данайцамі? Я раскажу.**

Неяк пахмурным днём з вуліцы данёсся залівісты брэх сабакі. Такім, звычайна, наш Рэкс «вітае» чужынцаў.

Выйшла з хаты — і сапраўды — каля брамкі маладая незнаёмая мне жанчына з вялікім чорным пакетам «шчабеча» з маім гаспадаром. Той, бачу, уважліва (як тыя дзеці новую цацку) разглядае нейкія нажы...

— І для вас таксама ёсць падарунак! — насустрач мне ўсміхаецца маладзіца. — Набор крэмаў. Як толькі вы пачняце імі карыстацца, твар стане — ну як пятая кропачка ў дзіцяці: усе маршчынкі разгладзяцца!

— А навошта? — спытала я ў шчабятухі. — Мне яны не замінаюць, маім дзецям ды ўнукам таксама. Яны мяне і з маршчынкамі любяць.

— Тады вазьміце казан, — тут жа пераключылася маладзіца і дастала з пакета нешта падобнае на звычайную патэльню. Гэта — у падарунак. Не сумнявайцеся, усе тавары найвышэйшай якасці! Ваша суседка Людміла Сяргееўна...

— Ёсць такая...

— Сабе ўзяла і крэмы, і казан, і так была задаволена, што мяне — аж расцалавала!

— Ды яна, — кажу, — цяпер мужа амаль не цалуе, бо вірус... А вы ёй — чужы чалавек... Яшчэ і без маскі...

— Я не хворая, — кажа візіцёрка.

— Але ж кантактуеце з рознымі людзьмі, падарункі во па вёсцы разносіце... Няўжо і праўда задарма? — пытаецца мой гаспадар.

— Для вас, — падкрэсліла маладзіца (і чым ёй мой чалавек спадабаўся?) — ну амаль што... За чыста сімвалічную плату: два наборы і казан усяго за 400 рублікаў.

— Ого!.. Дык дарагаватыя ж «падарункі», — здзівіўся муж.

— ...І грошай такіх мы не маем, — дабавіла я.

— А пад матрацам? — паказала «дасведчанасць» гандлярка. — Ну быць не можа, каб нештачка не схавалі!

— Не, — засмуціў гандлярку мы, — усе нашы сумленна заробленыя грошы — на банкаўскіх картках, што выгадна... Ва ўсякім разе такія вось «данайцы» не адразу іх выманяць.

...На гэтым мы і разышліся — скончылі размову з няпрошанай госцяй.

Потым даведаліся, што яна са сваімі «падарункамі» абышла ў вёсцы ледзь не ўсе падворкі. Усім расказвала, хто ў яе што купіў (у тым ліку і... мы), і як потым абдымалі ды цалавалі...

Праўда, людзі ў нас не такія і дурныя: не клюнулі на гэтую рэкламу, а таму гандлярка з якім пакетам у вёску прыехала, з такім і ад'ехала: ніхто ў яе нічога не купіў.

А назаўтра, як данесла мясцовае сарафаннае радыё, цэлы гандлёвы дэсант высадзіўся ў суседняй вёсцы. Там, праўда, «працавалі» па-іншаму: гаварылі, што хутка ў крамах нічога не будзе. Значыць, трэба ўсё купляць у запас і меняць у іх.

...Варта гэта рабіць ці не, кожны вырашае сам. Як на мой погляд, дык наўрад ці... Каб потым не шкадаваць ды не плакаць.

**Н. Б.,**
*Барысаўскі раён.*

Перажытае — незабытае

# З пажаданнем згоды і міру,

## што патрэбныя нам як паветра,

### альбо У бежанцах, дзе бежанцы — гэта мы

**...Вось толькі пабеглі, вядома ж, не самі: немцы прыгналі ў Сенненскі раён, у вёску Пальчыкі, і размеркавалі — па тры-чатыры сям'і ў адной хаце.**

Размяшчаліся там, хто як мог, найчасцей — на падлозе, якую проста ўсцілалі сеннікамі — большымі ці меншымі мяшкамі, набітымі сенам альбо саломай. Што ні кут — асобная сям'я. Але гэта — не вялікая бяда. Яна была б, калі б нашы сем'і, крый бог, разлучылі, калі б пагналі ў Нямеччыну, калі б расстралялі. А так мы заставаліся жывыя... Ва ўсякім разе — пакуль, бо галадалі страшэнна! У першыя дні мама яшчэ давала нам — мне, брацiку Геню і сястрычцы Зіне (пяць гадоў, два з паловай і паўтара) па сухарыку, змочаным у вадзе. Мы смакталі іх, стараліся надаўжэй расцягнуць асалоду, бо мама сказала, што больш у нас нічога няма...

Есці хацелася ўвесь час, хоць чаго-небудзь! Але мы не прасілі больш за тое, што давала мама.

Так, паўтаруся, было ў першыя два дні. На трэці — свой сухарык Зіначка не ўзяла. Яна перастала ўсміхацца — проста ляжала і глядзела на нас.

Мама стала непакоіцца, паклікала ў наш кут гаспадыню хаты. Тая прывяла да нас не тое знахара, не тое фельчара. Ён (я потым даznаюся) сказаў, што ў Зіны адзёр, што хвароба цяжкая...

Залатыя беларускія людзі: ім гэтае дзіця было чужое, яго трэці дзень толькі бачылі, аднак гаспадары той хаты, дзе нас пасялілі, аднекуль прынеслі для Зіны ложачак і так стараліся яе пакарміць...

Хоць тое было і марна, бо маленькая ўжо нічога не ела. Мама пыталася: «Дачушка, што табе даць? Што ты хочаш?..»

Зіна неяк шапнула: «Мяса...»

А там, на ўсю вёску, ніводнай каровы, свінні, авечкі ці нават кураніцы! Немцы стаялі ў суседняй вёсцы, у Пальчыкі тады — ні нагой, бо там гаспадарыў тыф, які не перашкодзіў ім выграбці ўсё: забраць з хлявоў апошнюю жыўнасць...

І зноў нашы людзі: неяк хутка ўся вёска ўжо ведала, што хворая паўтарагадовая дзяўчынка з бежанцаў хоча мяса. І праз тры дні аднекуль, можа, праз дваццатыя рукі, у хату ў палатнянай торбачцы прынеслі два яечкі і акрайчык хлеба. Там жа быў кавалачак (грам на 300) адваранага мяса. Зіна ўсё гэта бачыла, але нічога не ела...

Хавалі яе ўсёй вёскай і так, як належыць: зрабілі труну і крыжык, выкапалі магілку... Прыехаў вазніца з канём...

У Сенненскім раёне, каля вёскі Пальчыкі, сярод бяроз і вечназялёных соснаў пахавана мая сястрычка.

Прайшло шмат часу. Можа, там ужо іншыя дрэвы? Але ж веру, што вясной, праслаўляючы жыццё, у іх па-ранейшаму заліваюцца-пяюць салаўі, летам — цвітуць незабудкі, восенню — цёплым жоўтым лісцем укрываецца зямля і бліскучай расой плачуць туманы, а зімою галосяць мяцеліцы, засыпаючы даўняе гора бялюткім снегам...

Хоць гэта і марна: не засыпаць яго ніякімі снягамі!

...Пасяліўшы людзей у Пальчыках, немцы, відаць, разлічвалі, што яны будуць адчуваць сябе трэскамі ў магутнай жыццёвай плыні і там жа загінуць. Ну яшчэ б — у іх ні людскага жытла, ні адзення, ні абутку, ні хлеба — у матуль анічога, каб даць з'есці галодным дзецям...

Але ж самае страшнае з усіх тых «няма» — гэта «няма солі», бо калі не было бульбы — варылі лупіны, калі не было хлеба — хадзілі жабраваць, калі надыходзіла вясна, — хоць крыху аджывалі, бо з'яўляліся снітка і крапіва, на полі можна было знайсці крыху перамёрзлай бульбы і спячы з яе блін...

Дарэчы, бульбу тую збіралі мы, малыя. Не ведаю чаму, але фашысты па нас тады не стралялі. А вось па дарослых...

У суседняй вёсцы, непадалёк, на вышцы заўсёды стаяў нехта з узброеных да зубоў немцаў, і яму, як выглядала, было ўсё роўна, што па варонах страляць, што па людзях... Якія тады проста пухлі ад голаду, хварэлі і паміралі... Дарослыя — не толькі ад тыфу, дзеці — не толькі ад шкарлятыны і дыфтэрыі... У нас не было солі.

Мой брацік (хоць мама і жабравала — прыносіла ад людзей то па лустачцы хлеба, то па бульбінцы, а на Вялікдзень, помню, па сапраўдным чырвоным яйку) таксама апух, мачыўся з крывёй і хто ведае, што было б далей, калі б не дзве сястры-манашкі, якія жылі ў вёсцы. Яны, падобна, ведалі гаючыя ўласцівасці траў і ўзяліся паіць малога адварамі...

Аднекуль прынеслі дошкі ад бочкі, у якой калісьці трымалі соль, і варылі іх разам са стравамі.

А потым на тыф захварэла мама. І зноў сорак доўгіх дзён да нас прыходзілі тыя манашкі, як маглі, чым маглі, ратавалі яе і выратавалі!

...Што здзіўляла яшчэ, апроч узаемавыручкі, дык гэта тое, што печ у хаце, дзе мы жылі, была адна на ўсе чатыры сям'і (гаспадары плюс бежанцы), але ўсе яны, калі было з чаго, умудраліся нешта згатаваць. І пры гэтым аніколі ніякіх спрэчак, ніякіх папрокаў ці, крый бог, мацюкоў... Заўжды яго вялікасць разуменне, яе высокасць павага і дапамога. Для нас, малых, усе дарослыя былі проста ўзорам у зносінах!

...Прайшлі гады. Нашы людзі даўно пазбавіліся ад голаду, аднак дзеці вайны, іх нашчадкі, як мне здаецца, да скону не змогуць выкінуць кавалачак хлеба. І нават рассыпаўшы соль, будуць збіраць яе да апошняй дробкі.

...Імі, хлебам і соллю, мусіць, нездарма сустракаюць сяброў і маладых на вяселлях? Людзі тым самым выказваюць свае пажаданні здароўя, згоды і міру, якія ва ўсе часы патрэбныя нам, як тое ж паветра.

**Зоя НАВАЕНКА,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

Біяразнастайнасць

**Да нядаўняга часу мала хто ведаў, што ў нашай прыродзе яшчэ захаваліся рабыя суслікі. Дзякуючы піяр-кампаніі, разгорнутай АПБ, гэтыя вельмі рэдкія грызуны праславіліся і займелі прыхільнікаў і абаронцаў.**

# ШУКАЙЦЕ СУСЛІКА Ў ПОЛІ...

## Чаму гэты мілы грызун знаходзіцца пад пагрозай знікнення?

Нядаўна былі падведзены вынікі ініцыятывы «Хамяк, суслік і палятуха: выратаваць супергрызуноў!» Яна стартавала вясной 2019 года і ажыццяўлялася АПБ у супрацоўніцтве з навукова-практычным цэнтрам НАН Беларусі па біярэсурсах, Гарадоцкім лясгасам і эколага-краязнаўчым грамадскім аб'яднаннем «Неруш» у рамках праекта «Далучэнне грамадскасці да экалагічнага маніторынгу і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні». Праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды.

**Ініцыятыва «Выратаваць супергрызуноў!» атрымала прыз ад прадстаўніцтва Еўрасаюза за найлепшую піяр-кампанію.**

З трох відаў чырванакніжных грызуноў, якія заолагі шукалі па ўсёй краіне з дапамогай мясцовых жыхароў, найбольш пашанцавала суслікам. Эксперты выявілі дзевяць іх калоній з агульнай колькасцю каля 5000 асобін. Было зарэгістравана таксама некалькі мясцін пражывання вавёрак-палятух у Віцебскай вобласці. Хамяка ж пакуль не знайшлі ніводнага, але энтузіясты не адчайваюцца...

### ШТО ПАГРАЖАЕ КАЛОНІЯМ ЗВЯРКОЎ?

Яшчэ ў 1950—60-я гады на тэрыторыі Беларусі жылі мільёны суслікаў. Іх вынішчалі як шкоднікаў сельскай гаспадаркі. Але жорсткасць была дарэмная: суслікі харчуюцца пераважна травамі, а зерне складае малую частку іх рацыёну, так што значнай шкоды яны не наносяць. Гэтыя грызуны жывуць калоніямі на палях і пашах. Галоўныя сучасныя пагрозы для іх — глыбокае разворванне глебы, ужыванне пестыцыдаў і гербіцыдаў, драпежніцтва безнаглядных сабак і кошак.

Колькасць суслікаў катастрафічна змяншаецца паўсюль — ад Паволжа да заходніх меж арэала віду ў Польшчы. Таму вельмі важна зберагчы рэдкіх грызуноў у кожнай мясціне, дзе яны яшчэ засталіся. «Цяперашні стан рабых суслікаў крытычны, — б'е трывогу **эксперт АПБ Сяргей ШАКАЛА**. — Калі не будуць прымацца сур'ёзныя захады для іх аховы, у найбліжэйшыя дзесяць гадоў мы можам страціць гэты від».

Праблема ў тым, што мясцовыя органы ўлады неахвотна падпісваюць ахоўныя абавязацельствы для месцаў пражывання гэтых чырванакніжных звяркоў. **Дырэктар АПБ Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ** кажа:

— Мінулай восенню мы разаслалі ва ўсе гаспадаркі, на чыіх тэрыторыях знойдзены калоніі, інфармацыйныя лісты з папярэджваннем аб адказнасці за захаванне суслікаў. Але атрымалі сустрэчнае пытанне: «Хто нам кампенсуе штогадовыя страты ад выключэння зямель з севазвароту»? На сёння пад ахову ўзяты толькі дзве калоніі ў Капыльскім раёне і найбольш вялікая юшавіцкая калонія ў Нясвіжскім раёне, у якой налічваецца больш за 1000 суслікаў (ды і тое не цалкам: 90 гектараў са 107). Аднак знікаючыя віды неабходна ратаваць паўсюль, дзе яны выяўлены! Можна атрымліваць ад іх і прыбытак, калі наладзіць турыстычныя маршруты для ахвотных паназіраць за мілымі звяркамі.



### ЗОРКА ПІЯРУ

Суслік жвавы, забаўны і фотагенічны. У яго выразная міміка. Калі звярок чымсьці зацікаўлены, ён становіцца «слупком». Гэтыя грызуны не надта пужлівыя і могуць паказацца на вочы чалавеку, калі прывыкнуць да яго прысутнасці. Паміж сабой яны пераклікаюцца свістам.

АПБ зняла відэаролік пра сусліка, які будзе транслявацца ў грамадскім транспарце ў Брэсцкай, Гомельскай абласцях і ў Мінску. Таксама была праведзена здымка юшавіцкай калоніі з дрона. Роставыя фігуры суслікаў з інфармацыйнымі буклетамі ўсталяваны на аўтавакзале ў Нясвіжы і ў Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце.

Гэтай восенню эколага-краязнаўчае грамадскае аб'яднанне «Неруш» правяло асветніцкія сустрэчы са школьнікамі і настаўнікамі Баранавіцкага, Ляхавіцкага, Карэліцкага, Клецкага, Капыльскага раёнаў, навучэнцамі Навагрудскага і Ляхавіцкага аграрных каледжаў, студэнтамі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама спецыялістамі лясгасаў і прадстаўнікамі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

— Мы звярталіся да людзей, каб яны дапамагалі выяўляць мясціны, дзе жывуць суслікі, і ўлічвалі, што захаванне рэдкіх жывёл павышае прэстыж раёна, — сказаў **старшыня «Неруша» Уладзімір ЗУЕЎ**. — Спадзяёмся, што наша інфармацыя спрацуе і колькасць пагроз для суслікаў будзе змяншацца.

### ЯК ЗАХАВАЦЬ СУПЕРГРЫЗУНОЎ?

— Пашукайце ў сваёй мясцовасці: раптам недзе ўпотай жыве невялічкая калонія гэтых звяркоў? Калі вам пашанцуе, паведаміце пра сваю знаходку ў АПБ.

— Не разворвайце поле ці пашу, дзе пасяліліся суслікі, а лепш выкарыстоўвайце гэтую тэрыторыю для выпасу свойскай жывёлы. У кароткай траве, пад'едзенай каровамі, грызуны хутчэй заўважаць драпежніка і паспеюць схавацца ў норы.

— Не складзіруйце ў месцы пражывання суслікаў угнаенні, хімікаты, будматэрыялы.

— Не дапускайце свабоднага выгулу сабак і кошак, каб яны не палявалі на суслікаў.

— Не пужайце звяркоў, не шуміце, не распальвайце вогнішча ў межах калоніі.

— АПБ бярэ супергрызуноў пад пастаянную апеку, — запэўніў Аляксандр Вінчэўскі. — Будзем намагацца, каб усе вядомыя месцы пражывання суслікаў узялі пад ахову. Сумесна з супрацоўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук будзем шукаць сродкі, каб развіваць экалагічны турызм, вывучаць досвед Польшчы і Украіны і рассяляць вельмі рэдкіх грызуноў туды, дзе яны жылі раней.

**Святлана ІШЧАНКА.**
**Фота Сяргея ШАКАЛЫ.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

## «ЗВЯЗДА»: ЦЁПЛЫЯ СЛОВЫ, ЦЁПЛЫЯ РЭЧЫ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі тэрмінам з 1 снежня 2020 года да 31 сакавіка 2021 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда», — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. кап. | Усяго з ПДВ, руб. кап. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Маслены радыятар General Climate NY23LA, (далей — Суперпрыз) | 1 | 134,00 | 134,00 |
| 2 | Камізэлька жаночая м. 210, арт. 982C, (далей — Прыз | 7 | 53,00 | 371,00 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» складае: — 505,00 (пяцьсот пяць) рублёў.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 снежня 2020 года да 12 студзеня 2021 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 да 31 снежня 2020 года.

7. Адзін падпісчык можа дасылаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі Установе пасля 12 студзеня 2021 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Дашкевіч Юлія Андрэеўна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Брашко Алег Мікалаевіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ. ПАВЕДАМЛЕННЕ ПЕРАМОЖЦАМ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 15 студзеня 2021 года а 12 гадзіне ў памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца 7 прызоў (па адным для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка пазначаецца выйграны прыз і ставяць подпіс члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 25 студзеня 2021 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 25 студзеня 2021 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

Пры звяртанні на атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2021 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал ці першае паўгоддзе 2021 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што гэта не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 31 сакавіка 2021 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам гульні па тэлефонах (017) 263 66 73, 311 17 40 для атрымання прапускных дакументаў). Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў для атрымання прыза або суперпрыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаюцца.

20. Пасля 31 сакавіка 2021 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні несуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Звязда»: цёплыя словы, цёплыя рэчы» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Дадзеныя, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефонах (017) 263 66 73, 311 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3885 ад 11.11.2020 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

СЁННЯ фотамайстар Юрый Іваноў працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на пасадзе спецыяліста па сувязях з грамадскасцю. Месца работы абавязвае здымаць хроніку жыццядзейнасці аўтарытэтнай ВНУ краіны. Ды перад любымі абавязкамі — талент, гарэнне тымі справамі, якімі жыве беларуская нацыянальная культура, расквечаная многімі і многімі дасягненнямі менавіта студэнтаў, выкладчыкаў, выпускнікоў універсітэта культуры і мастацтваў... І так атрымалася, што за гады дзейнасці ў студэнцкім, прафесарскім асяроддзі Юрый Сяргеевіч разгледзеў, вылучыў — рэльефна, вобразна — многія з'явы культуры ўсёй нашай краіны. Вядома ж, у рабоце майстру спрыяе і тое, што сам па сабе ўніверсітэт заўжды быў і застаецца скарбніцай высокіх творчых здзяйсненняў.

Юрый Іваноў, і гэта відавочна, перакананы ў тым, што і паказ «Каляднай варажбы», і творчая сустрэча ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» з народным артыстам СССР і народным артыстам Рэспублікі Беларусь, славутым харэографам Валянцінам Елізар'евым, і выступленні капэлы беларускіх народных духавых інструментаў «Гуды», хору «Дабравест», фальклорнага ансамбля «Грамніцы» — усё гэта партрэт сённяшняй беларускай культуры. Калі гартаеш альбом фотамастака менавіта пра ўніверсітэт культуры (тут у пэўнай ступені — толькі вобраз, бо такога альбома як асобнага кніжнага, мастацкага выдання яшчэ няма), разумееш, што зрабіць такія здымкі іх аўтару дапамагае вялікая любоў. Не толькі да сваёй прафесіі, сваёй уласнай творчасці, але найперш — любоў да людзей, якія становяцца героямі яго ўнікальных ілюстрацый часу. І часу культуры — таксама.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**
**Фота Юрыя ІВАНОВА.**



# ЧАС КУЛЬТУРЫ











# ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М. извещает о проведении 9 декабря 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | |
| | **Местонахождение лотов №№ 1–23, 25–26:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5035** общей площадью **1 402,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание. Капитальное строение с инв. № 324/С-5037** общей площадью **322,6** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание бытового помещения с двумя пристройками.** Навес с передвижными воротами (инв. № 2082). Уборная, (инв. № 2009). Котел водогрейный КВ-80 (инв. № 2078). Котел водогрейный КВ-80 (инв. № 2078а). Котельная (инв. № 2142). Благоустройство территории базы (асфальтобетонное покрытие и асфальтобетонная дорожка) (с инв. № 2127), участок № 1 (асфальтобетонное покрытие 500,0 кв. м), асфальтобетонная дорожка 12,0 кв. м. Благоустройство территории базы (асфальтобетонное покрытие и асфальтобетонная дорожка) с инв. № 2127 участок № 2 (асфальтобетонное покрытие 800 кв. м. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002762** общей площадью **0,5247 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **299 100,00** | 14 955,00 | 29 910,00 |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5039** общей площадью **803,5** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание мастерской с пристройками. Капитальное строение с инв. № 324/С-8673** общей площадью **29,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **сторожка.** Благоустройство базы (покрытие из ж/бетон., покрытие бетонное) (с инв. № 227), участок № 1 (покрытие бетонное 935,0 кв. м, покрытие из ж/бетон. 867,0 кв. м, бордюр 234,0 м). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002756** общей площадью **0,4734 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **42 700,00** | 2 135,00 | 4 270,00 |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5045** общей площадью **614,6** кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада № 1 с пристройками. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002759** общей площадью **0,1550 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **16 800,00** | 840,00 | 1 680,00 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5038** общей площадью **392,4** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание материального склада № 2 с навесом.** Благоустройство базы (покрытие из ж/бетон., покрытие бетонное) с инв. № 227, участок № 4 (покрытие бетонное 780,0 кв. м, покрытие из ж/бетон. 722,0 кв. м, бордюр 195,0 м). Забор стройдвора бетонный сплошной с инв. № 53/2 участок № 1 – 375,0 кв. м. Металлические ворота с инв. № 53/3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001000070** общей площадью **0,2697 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **30 565,00** | 1 528,25 | 3 056,50 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5044** общей площадью **40,7** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции. Капитальное строение с инв. № 324/С-5040** общей площадью **557,0** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное здание гаража.** Благоустройство базы (покрытие из ж/бетон., покрытие бетонное) с инв. № 227, участок № 2 (покрытие бетонное 935,0 кв. м, покрытие из ж/бетон. 867,0 кв. м, бордюр 234,0 м). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002755** общей площадью **0,1806 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **41 050,00** | 2 052,50 | 4 105,00 |
| 6 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5041** общей площадью **357,2** кв. м, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, наименование – **одноэтажное кирпичное здание для ремонта и технического обслуживания автомобилей.** Забор стройдвора кирпичный с инв. № 53. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002760** общей площадью **0,0802 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **14 900,00** | 745,00 | 1 490,00 |
| 7 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-9410** общей площадью **44,7** кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **здание гаража. Капитальное строение с инв. № 324/С-9430** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **эстакада для автомашин. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002758** общей площадью **0,0589 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **3 000,00** | 150,00 | 300,00 |
| 8 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5042** общей площадью **423,1** кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – **здание лесопильного цеха с пристройкой. Капитальное строение с инв. № 324/С-8791** общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **навес к лесопильному цеху. Капитальное строение с инв. № 324/С-5043** общей площадью **415,7** кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с пристройкой. Капитальное строение с инв. № 324/С-8790** общей площадью **33,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **сушилка с навесом. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002761** общей площадью **0,5627 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **30 950,00** | 1 547,50 | 3 095,00 |
| 9 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-8671** общей площадью **65,0** кв. м, назначение – здание нежилое, наименование – **компрессорная.** Забор стройдвора блочный с металлическим обрамлением с инв. № 53/1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002754** общей площадью **0,0430 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **2 315,00** | 115,75 | 231,50 |
| 10 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-8670** общей площадью **230,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **склад заполнителей РБУ.** Забор стройдвора бетонный сплошной с инв. № 53/2 участок № 2 – 460,0 кв. м **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002763** общей площадью **0,5426 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **7 500,00** | 375,00 | 750,00 |
| 11 | **Капитальное строение с инв. № 324/С-5036** общей площадью **335,5** кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **двухэтажное кирпичное здание растворобетонного узла с пристройкой.** Благоустройство базы (покрытия из ж/бетон., покрытие бетонное) с инв. № 227 участок № 3 (покрытие бетонное 468,0 кв. м, покрытие из ж/бетон. 434,0 кв. м, бордюр 117,0 м). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **325650100001002757** общей площадью **0,1925 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Советская, д. 42 | **18 800,00** | 940,00 | 1 880,00 |
| 12 | **Станция штукатурная ШС-6 (инв. № 808)** | **1 750,00** | 87,50 | 175,00 |
| 13 | **Автомобиль грузовой специальный автобетоносмеситель КАМАЗ 53229 ABS69361**, кузов (рама) № XTC53229R72302894, X4869361N70074706, 2007 года выпуска, рег. знак АВ 1144-3 (инв. № 2046). **Автобус-вагон ПАЗ 32053**, кузов (рама) № X1M3205E070008334, 2007 года выпуска, рег. знак АК 8651-3 (инв. № 792). **Бульдозер ДТ-75**, № 584498, 1986 года выпуска (инв. № 2039) | **10 900,00** | 545,00 | 1 090,00 |
| 14 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ-533603-220**, кузов (рама) № Y3M53360370005915, 2007 года выпуска, рег. знак АК 8652-3 (инв. № 791) | **3 100,00** | 155,00 | 310,00 |
| 15 | **Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5551А2 323**, кузов (рама) № Y3M5551A280001152, 2008 года выпуска, рег. знак АК 8634-3 (инв. № 813) | **5 550,00** | 277,50 | 555,00 |
| 16 | **Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5551А2 325**, кузов (рама) № Y3M5551A280001267, 2008 года выпуска, рег. знак АК 8654-3 (инв. № 801) | **5 550,00** | 277,50 | 555,00 |
| 17 | **Грузовой седельный тягач МАЗ 6422 А5**, кузов (рама) № Y3M6422A580000572, 2008 года выпуска, рег. знак АК 8653-3 (инв. № 802). **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2009**, кузов (рама) № Y3M97580090011603, 2009 года выпуска, рег. знак А 3368 А-3 (инв. № 2097) | **8 300,00** | 415,00 | 830,00 |
| 18 | **Грузовой седельный тягач МАЗ 6430А8**, кузов (рама) № Y3M6430A890000869, 2009 года выпуска, рег. знак АК 8638-3 (инв. № 845). **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800**, кузов (рама) № Y3M97580080011167, 2008 года выпуска, рег. знак А 1387 В-3 (инв. № 803) | **9 950,00** | 497,50 | 995,00 |
| 19 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 5336 А3**, кузов (рама) № Y3M5336A390000811, 2009 года выпуска, рег. знак АВ 9085-3 (инв. № 2096). **Полуприцеп специальный цистерна NPC-22 DK**, кузов (рама) № Y69AC22228PA48067, 2008 года выпуска, рег. знак А7143 А-3 (инв. № 2141) | **5 950,00** | 297,50 | 595,00 |
| 20 | **Автомобиль грузовой бортовой МАЗ 5336 А3**, кузов (рама) № Y3M5336A380000561, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 6517-3 (инв. № 2184). **Прицеп бортовой МАЗ 837810**, кузов (рама) № Y3M83781080011730, 2008 года выпуска, рег. знак А 2349 А-3 (инв. № 2188) | **6 850,00** | 342,50 | 685,00 |
| 21 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2010**, кузов (рама) № Y3M97580080011105, 2008 года выпуска, рег. знак 2014 АА-3 (инв. № 2063) | **3 450,00** | 172,50 | 345,00 |
| 22 | **Прицеп бортовой MAZ 837810**, кузов (рама) № Y3M83781070010846, 2007 года выпуска, рег. знак А 1389 В-3 (инв. № 793) | **2 800,00** | 140,00 | 280,00 |
| 23 | **Прицеп бортовой МАЗ 837810 042**, кузов (рама) № Y3M83781080012096, 2008 года выпуска, рег. знак А 8085 А-3 (инв. № 2076) | **3 150,00** | 157,50 | 315,00 |
| 25 | **Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW-1400**, заводской (серийный, идентификационный) № Y39W14000710067, 2010 года выпуска, рег. знак ЕВ-3 3173 № инв. 2125 | **29 750,00** | 1 487,50 | 2 975,00 |
| 26 | **Виброкаток двухколесного LTC06**, инв. № 841, 2008 года выпуска | **4 650,00** | 232,50 | 465,00 |
| 27 | **Изолированное помещение с инв. № 310/D-1736** общей площадью **1 298,6 кв. м,** назначение – помещение административно-бытового корпуса, наименование – **помещение административно-бытового корпуса. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4-1 | **70 500,00** | 3 525,00 | 7 050,00 |
| 28 | **Капитальное строение с инв. № 310/С-2990** общей площадью **5 928,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **материальные склады. Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка. Асфальтовое покрытие (инв. № 00000097) участок 2; ограждение из железобетона (инв. № 0002004). Бордюр (инв. № 00000082). Покрытие из железобетонных плит (инв. № 00400068). **Адрес:** Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, 4Г. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000372** общей площадью **1,1147 га (право постоянного пользования)** | **254 325,00** | 12 716,25 | 24 432,50 |
